ДЗЕДЗІЧ
Зберагчы і паўяльнічаць

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

# ДЗЕДЗІЧ

*Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць.*
*(Янка КУПАЛА)*

№ 1 (40)
САКАВІК 2007

2 АГУЛЬНАБЕЛАРУСКІ ФЛЭШ-МОБ
Адключыся ад «БРАХУЧКІ»

4 ШТО ТАКОЕ ФЛЭШ-МОБ?
І што такое беларускі флэш-моб?

6 РАСЕЯ ЦІ ЕЎРОПА?
Чыя літаратура нам бліжэй

8 ДЗЕСЯЦЬ СУТАК
за глыток свабоды

# СА СВЯТАМ ЦЯБЕ, БЕЛАРУСЬ!

**ШАНОЎНЫЯ БЕРАСЦЕЙЦЫ!**
**Віншуем Вас з вялікім нацыянальным святам нашай краіны!**

25 сакавіка Беларусь адзначае найвялікшае свята ў сваёй тысячагадовай гісторыі. У гэты дзень у 1918г. Рада Беларускай Народнай Рэспублікі абвясціла Беларусь **«незалежнай і вольнай дзяржавай»**. Беларусы заявілі на ўвесь свет, што яны жадаюць будаваць свой дом, што яны вартыя называцца народам.

З таго часу мінула шмат гадоў. Шмат пакут і выпрабаванняў выпала на долю беларускага народа. І нашы бацькі і дзяды паказалі, што яны вартыя «Людзьмі звацца»!

Сённяшні рэжым ізноў ставіць беларускі народ на мяжу выжывання. Рост камунальных тарыфаў, беспрацоўе, ціск на прадпрымальнікаў, замоўчванне чарнобыльскіх праблем – у такіх умовах добра жывуць толькі чыноўнікі з прэзідэнцкай «вертыкалі». Адсутнасць перспектыў на лепшую будучыню вядзе да таго, што 70% моладзі марыць з'ехаць за мяжу. **А хто застанецца тут?!**

Верым, што і сёння мы здольныя адстаяць незалежнасць краіны, каб мець будучыню – **у свабоднай квітнеючай Беларусі.**

**ДА ЛЕПШАГА ЖЫЦЦЯ – ПРАЗ НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ!**



## ДАРАГІЯ СУАЙЧЫННІКІ!

Студзень 2007 г. стаў пераломным у лёсе Беларусі. Цалкам правалілася палітыка А.Лукашэнкі, накіраваная на "будаўніцтва Саюзнай дзяржавы". Скончыліся размовы аб "братэрстве і раўнапраўі". Крэмль ужыў энергетычны рычаг і, нарэшце, ясна сфармуляваў свае патрабаванні да Беларусі: увесці расейскі рубель, правесці рэферэндум аб саюзнай дзяржаве і, урэшце рэшт, увайсці ў склад Расейскай Федэрацыі.

У выніку беларускі дзяржаўны бюджэт зменшыцца на 3 млрд. даляраў. Гэта пацягне за сабой значны рост камунальных плацяжоў, коштаў на прадукты першай неабходнасці, банкруцтва ўсіх нізкарэнтабельных прадпрыемстваў.

Выйсце – у мадэрнізацыі беларускай прамысловасці з мэтай знізіць энергавыдаткі на адзінку прамысловай прадукцыі ў 2 разы (як у Аўстрыі ці Нямеччыне) і выйсці на новыя, у тым ліку еўрапейскія, рынкі. Але ў беларускім бюджэце неабходных грошаў няма. Без еўрапейскіх ці амерыканскіх інвестыцыяў і тэхналогій праблему вырашыць немагчыма.

У канцы 2006г. Еўрапейскі Звяз зрабіў канкрэтныя прапановы наконт эканамічнай супрацы з Беларуссю.

Гэта фінансаванне:

– мадэрнізацыі беларускіх прадпрыемстваў з мэтаю доступу нашых тавараў на рынак Еўрапейскага Звязу;

– мадэрнізацыі транспартнай сістэмы Беларусі;

– мадэрнізацыі энергетычнай сістэмы Беларусі;

– супрацы памежных раёнаў Еўрапейскага Звязу і Беларусі;

– праектаў паляпшэння якасці вады, перапрацоўкі адкідаў, ліквідацыі наступстваў Чарнобыльскай катастрофы.

Гэта таксама:

– Ільготны візавы рэжым для ўезду ў краіны Еўрапейскага Звязу;

– Ільготнае крэдытаванне малога і сярэдняга бізнэсу;

– Наданне беларускім студэнтам стыпэндыяў для навучання ва універсітэтах Еўропы.

Але Еўрапейскі Звяз выставіў 12 дэмакратычных перадумоваў рэалізацыі гэтых праграмаў. Сярод іх найпершыя:

1. Вызваліць усіх палітычных вязняў;
2. Даць свабоду незалежнай прэсе;
3. Не ўжываць сілу супраць мірных маніфестантаў;
4. Дапусціць у выбарчыя камісіі прадстаўнікоў усіх кандыдатаў з мэтаю гарантыяў ад фальсіфікацыі выбараў.

Пакуль што А.Лукашэнка адмаўляецца зрабіць гэтыя мінімальныя крокі па дэмакратызацыі Беларусі. Прычыны таму – толькі асабістыя амбіцыі і неразумная ўпартасць. Бо выкананне гэтых чатырох пунктаў не можа нашкодзіць ніводнаму беларусу, у тым ліку і А.Лукашэнку. А карысць для Беларусі будзе велізарная.

## ЗА СВАБОДНУЮ І НЕЗАЛЕЖНУЮ БЕЛАРУСЬ!

Грамадзяне! Мы не можам быць закладнікамі амбіцыяў аднаго чалавека.

Заклікаем усіх людзей, каго хвалюе свой уласны лёс, лёс сваіх блізкіх, лёс нашай краіны, выйсці 25 Сакавіка на Кастрычніцкую плошчу і запатрабаваць ад А.Лукашэнкі тэрмінова выканаць умовы Еўрапейскага Звязу. Кожны дзень прамаруджвання пазбаўляе беларускія сем'і значнай часткі іх будучага дабрабыту, а нашу краіну штурхае ў эканамічную прорву.




**Выйдзем 25 Сакавіка ў 12.00 на Кастрычніцкую плошчу ў Менску!**

**МЫ – ЗА СВАБОДНУЮ І НЕЗАЛЕЖНУЮ БЕЛАРУСЬ!**

**Кааліцыя Аб'яднаных дэмакратычных сіл**

АДНЫМ РАДКОМ

## БРСМ ЗАКЛІКАЕ: ЧАС ЗБІРАЦЬ КАМЯНІ!

Берасцейскі гарадскі камітэт Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі шукае жадаючых працаўладкавацца.

Працоўных месцаў, якія прапаноўвае БРСМ, шмат. Праўда, усе яны толькі па адной спецыяльнасці: збор камянёў з поля.

Маладым берасцейцам прапануюць штодзённую працу па 7-8 гадзін у дзень на палях Камянецкага раёна падчас веснавых палявых работ – з 1 сакавіка па 30 красавіка. Што тычыцца заробку, то за 1 тону сабраных камянёў абяцаюць плаціць па 9000 рублёў. Кіраўніцтва Берасцейскага гаркама БРСМ сцвярджае, што за дзень малады чалавек можа з лёгкасцю зарабіць 18-22 тысячы рублёў.

Больш інтэлектуальнай працы ў гаркаме маладым берасцейцам пакуль прапанаваць, на жаль, не могуць.

**Dzedzich week-news**

## КОЛЕР КАХАННЯ – ЧЫРВОНА-ЗЯЛЁНЫ

У Жабінцы ў лютым БРСМ праводзіў акцыю "За любімую Беларусь", прымеркаваную да Дня Святога Валянціна.

Для ўдзелу ў ёй маладым людзям прапаноўвалі падрыхтаваць чырвона-зялёныя сэрцы з добрымі словамі і пажаданнямі радзіме і перадаць у раённы камітэт БРСМ.

Выказваць свае пачуцці на нетрадыцыйна двухколерных валянцінках можна было ў адрас родных і сваякоў, сяброў і знаёмых, а таксама ў адрас роднага краю, горада ці вёскі. Пасля 15 лютага лепшыя працы, па словах арганізатараў акцыі, былі ўзнагароджаныя.

Але жабінкоўская моладзь халадно паставілася да акцыі па вырабу нетрадыцыйных валянцінак. Алена Пашкевіч, вучаніца 11-га класа СШ №1 Жабінкі, тлумачыць, чаму яе аднакласнікі не ўдзельнічалі ў акцыі:

– Традыцыйна валянцінкі бываюць толькі аднаго, чырвонага колеру. Яны б яшчэ абвесцілі конкурс на самага прыгожага чырвона-зялёнага снегавіка. Штосьці мы не чулі пра тое, каб, напрыклад, на Украіне валянцінкі рабілі жоўта-блакітнага колеру.

**Dzedzich week-news**

## ЗА РЭКЛАМУ НА ЗАМЕЖНАЙ МОВЕ ТРЭБА ПЛАЦІЦЬ!

Берасцейскім прадпрыемствам давядзецца плаціць за рэкламу на замежнай мове.

Берасцейскі абласны Савет дэпутатаў увёў збор за размяшчэнне вонкавай рэкламы на замежных мовах, а таксама зарэгістраваных таварных знакаў на замежных мовах.

Збор складае 10 базавых велічынь (310 тысяч рублёў) за кожны аб'ект падаткаабкладання ў месяц. Напрыклад, мабільнаму аператару "Velcom", каб размясціць на рэкламным плакаце свой лагатып, неабходна дадаткова заплаціць 310000 за кожны плакат.

Прычым фірмам давядзецца плаціць нават у тым выпадку, калі слова не замежнае, а беларускае, але напісана лацініцай.

Як паведамілі ў фінансавым упраўленні Берасцейскага аблвыканкама, такі збор хутка будзе ўведзены ў Магілёўскай вобласці, а да канца 2007 года – ва ўсіх абласцях і ў Менску.

**Dzedzich week-news**

# АГУЛЬНАБЕЛАРУСКІ ФЛЭШ-МОБ 15 САКАВІКА

**15 сакавіка адлучыся ад РАДЫЁКРОПКІ! І атрымай безлімітны тарыф без лукавай прапаганды!**

Шмат хто з нас нават не падазрае, што да гэтага часу ёсць спонсарам лукавай прапаганды, аплочваючы радыёкропку («брахучку»).

У кагосьці няма прыёмніка, у кагосьці засталіся толькі правады, хтосьці забыўся пра яго існаванне, але графа аплаты «брахучкі», як кампутарны вірус подла маскіруецца ў квітанцыях за камунальныя плацяжы.

Радыёкропка – мудрагелістая паслуга: пры набыцці кватэры ці засяленні ў новы дом вам не прапануюць заключыць дамову на мозгадрабільнае вяшчанне, а прымусова зробяць абанентам «брахучкі».

Ігнараваць аплату радыёкропкі і спадзявацца на выключэнне за пазыкі не варта, вы проста не зможаце заплаціць асобна за камунальныя паслугі, не пералічыўшы грошы за «брахучку».

Адзіны спосаб пазбавіцца навязлівай паслугі – прыйсці ў радыёвузел (трэба мець пашпарт) і запоўніць заяву на "абразанне" радыёкропкі.

**Перад Днём Волі ты можаш паменшыць колькасць хлусні ў эфіры!**




**15-га сакавіка прыйдзі ў радыёвузел свайго горада і адмоўся ад хлусні.**

Гэта не мітынг у цэнтры горада, але напэўна гэта дасць штуршок да чагосьці большага…

Група ўліку абанентаў радыёсеткі Берасця: вул. Куйбышава, 60\1, 1-ы паверх, т. 21-79-23, 22-16-43. Штодзённа з 8-00 да 18-00, без абеда. СБ – да 16-00, Нядз. – выходны.

**Уладзімір РАДЗІВОНЧЫК, прадстаўнік Берасцейскай абласной арганізацыі МХСС «Маладыя дэмакраты»**

## АДБЫЛАСЯ АБЛАСНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ПАРТЫІ БНФ

25 лютага у Берасці прайшла абласная справаздачна-выбарчая канферэнцыя Партыі БНФ. 30 дэлегатаў з 12 раёнаў сабраліся, каб ацаніць працу ў 2006г. і абмеркаваць планы на будучыню.

Падаўляльная большасць дэлегатаў станоўча ацаніла дзейнасць Рады і аказала давер яе старшыні сп. Юрыю Губарэвічу, даручыўшы яму кіраўніцтва арганізацыяй у наступным годзе.

На сходзе была агучана інфармацыя пра будаўніцтва ў Кобрыне царквы-помніка ў гонар ката беларускага народа Аляксандра Суворава. Дэлегат канферэнцыі сп. Аляксандр Мех адзначыў:

– Назваць у Кобрыне царкву ў гонар Суворава тое ж самае, што назваць нацыянальную бібліятэку ў Менску ў гонар гаўляйтэра Беларусі Вільгельма Кубэ.

Удзельнікі канферэнцыі вырашылі правесці кампанію супраць надання новай царкве імя душыцеля паўстання Тадэвуша Касцюшкі. План кампаніі прадугледжвае акцыі па інфармаванні жыхароў Кобрына пра злачынствы карнікаў Суворава, збор подпісаў пад патрабаваннем не надаваць новай царкве імя Суворава, іншыя мерапрыемствы.

Гарачая дыскусія адбылася па пытаннях, звязаных з узаемаадносінамі ў кааліцыі аб'яднаных дэмсіл. У выніку большасцю галасоў была прынята рэзалюцыя аб падтрымцы намаганняў па развіцці Руху "За Свабоду" на чале з Аляксандрам Мілінкевічам. У рэзалюцыі адзначаецца, што Берасцейская абласная арганізацыі Партыі БНФ далучаецца да дзейнасці Руху "За Свабоду". Рэзалюцыя заклікае ўсіх сяброў Партыі БНФ браць актыўны ўдзел у дзейнасці Руху.

Напрыканцы сустрэчы сп. Рыгор Бакіевіч прэзентаваў дэлегатам інфармацыйны бюлетэнь "Наш выбар", які летась аднавіў выхад пасля доўгага перапынку. А ўжо вечарам у цягніку «Берасце-Віцебск» 4 дэлегаты канферэнцыі былі затрыманыя супрацоўнікамі транспартнай міліцыі. Як паведаміў адзін з затрыманых, сп. Віталь Каратыш, міліцыянтаў зацікавіў менавіта бюлетэнь "Наш выбар". 100 асобнікаў бюлетэня было канфіскавана з мэтай праверкі законнасці яго выхаду.

## УТВОРАНА НОВАЯ СУПОЛКА ПАРТЫІ БНФ

5 сакавіка ў Берасці адбыўся устаноўчы сход сябраў Партыі БНФ, якія вырашылі ўтварыць новую партыйную суполку.

На фоне ціску ўладаў на актывістаў дэмакратычных арганізацый і ліквідацыі шматлікіх НДА гэтая падзея з'ўляецца выключэннем з правілаў. Сябрамі суполкі сталі актывісты, якія прыйшлі ў партыю ў 2006-м годзе. У гонар 125-цігоддзя з дня нараджэння песняра Беларусі Янкі Купалы сход прыняў рашэнне аб наданні новай суполцы імя "Купалаўская". Сход вырашыў паставіць новую суполку на ўлік ва Упраўленні юстыцыі.

На сходзе ў якасці дарадцы і назіральніка прысутнічаў Старшыня Рады Берасцейскай гарадской арганізацыі Партыі БНФ сп. Дзмітрый Шыманскі. ¨н адзначыў, што новая суполка з'явілася ў Берасці ўпершыню за апошнія 4 гады:

— З 2003 года ў Берасці не было ўтворана ніводнай суполкі. Не толькі ў Партыі БНФ, але і ва ўсіх іншых дэмакратычных партыях. Таму бяспрэчна сённяшняя падзея – надзвычайная. У сувязі з палітычнымі падзеямі мінулага года, у першую чаргу, прэзідэнцкімі выбарамі, да нас у партыю прыходзіць шмат новых людзей. Утварэнне суполкі дазволіць нам арганізаваць іх працу.

Старшынёй суполкі адзінагалосна абраны Анатоль Ярмак, актывіст штаба А. Мілінкевіча, кандыдат у дэпутаты на мясцовых выбарах. Анатоль мае вышэйшую адукацыю і працуе інжынерам на адным з прадпрыемстваў СЭЗ "Брэст".

**Dzedzich week-news**

# COMMUNITY STUDENTY.BY

**ШТО ГЭТА ЗА СЛОВА ТАКОЕ НАВАМОДНАЕ – COMMUNITY, І ЧАМУ ЎСЁ ЧАСЦЕЙ ЯГО МОЖНА ПАЧУЦЬ НА ВЕЧАРЫНАХ АБО ІМПРЭЗАХ?**

Адказ на гэтае пытанне, насамрэч, вельмі просты: community – гэта суполка моладзі, аб'яднаная адзінай мэтай. Вось, напрыклад, community аматараў цюнінгу, або community прыхільнікаў рок-музыкі.

Але зараз размова пойдзе пра нешта больш цікавае і захапляючае – пра community studenty.by з Менску. З'явілася гэтая суполка 2 гады таму як інфармацыйная платформа для студэнтаў розных ВНУ, што жадаюць атрымліваць навіны пра жыццё моладзі з Беларусі і па-за яе межамі. (Калі хто не здагадаўся, studenty.by – гэта сайт, дзе размешчана шмат карыснага).

Калі ўсё пачыналася, у community было 5 чалавек, якія збіраліся разам, абмяркоўвалі нейкія пытанні, працавалі над сайтам. Але вельмі хутка, дзякуючы намаганням пачынальнікаў, сайт, а потым і стыль жыцця ў community, атрымаў вялікі распаўсюд і павагу.

Зараз быць сябрам community – гэта не толькі стыльна і модна, а гэта яшчэ і неабмежаваныя магчымасці, якія прапаноўвае community для сваіх сяброў. Я маю на ўвазе, што праз community студэнты выязджаюць за мяжу, ладзяць цікавыя вандроўкі, і разам з тым, атрымліваюць юрыдычную падтрымку.

Летась community studenty.by святкавала 2 гады сваёй працы і першую 1000 карыстальнікаў. Але цікава тое, што святкавалі яны ў вельмі інавацыйнай форме, у фармаце community-party. Гэта не проста нейкая чарговая імпрэза, а сапраўдная модная фішка для менскай моладзі.

На так званую "party" запрашаліся наведвальнікі сайта, якім падабаецца community і хто жадае быць на хвалі. Уваход на "party" адбываўся па спецыяльных запрашэннях, якія потым абменьваліся на піва. Шчыра кажучы, "party" атрымалася сапраўды арыгінальнай: сябры community слухалі выступ цікавых музыкаў, удзельнічалі ў аукцыёне (напрыклад, медыятар аднаго з гітарыстаў быў прададзены за 2 піццы), знаёміліся і адпачывалі. Як бачыце, "party" – гэта новы фармат для стыльнай моладзі, якая дыхае паветрам свабоды і якая здольная на арыгінальныя крокі.



**Minsk_by party – вечарына ўдзельнікаў суполкі livejournal minsk_by 18 лістапада ў клубе Графіці.**



І напрыканцы хацелася б прааанансаваць "Дзедзіч-party", якая адбудзецца ў чэрвені і паабяцаць, што тых, хто атрымае запрашэнне, чакае шмат чаго прыкольнага і сцёбнага. Чакаем таксама вашых цікавых ідэй.

**Марыя СЯЛЯГІНА**

# ХТО ПАЛЕПШЫЦЬ ЖЫЦЦЁ Ў ІНТЭРНАТАХ?

**СТУДЭНТЫ, ШТО ЖЫВУЦЬ У ІНТЭРНАТАХ БЕРАСЦЕЙСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА, НЕ ЗАДАВОЛЕНЫ СВАІМІ ПОБЫТАВЫМІ ЎМОВАМІ.**

Пра гэта сведчаць вынікі апытання, якое ў лютым правёў "Дзедзіч" сярод студэнтаў-інтэрнатаўцаў БрДУ.

Мэтай апытання было вызначэнне "балявых кропак" інтэрнацкага жыцця, лячэннем якіх могуць заняцца моладзевыя і студэнцкія арганізацыі. Апытана было больш за 200 студэнтаў. 83% з іх лічаць матэрыяльна-побытавыя ўмовы жыцця ў інтэрнатах нездавальняючымі.

Сярод найбольш значных праблемаў называліся нізкі ўзровень матэрыяльна-тэхнічнай базы інтэрнатаў, дрэнны стан мэблі, перыядычная адсутнасць гарачай вады, неабходнасць рамонту як асобных пакояў, так і будынкаў цалкам.

Студэнты зазначылі, што неаднаразовыя звароты да кіраўніцтва інтэрнатаў і рэктара ВНУ не вырашаюць пакуль іх праблемаў.

Як паведаміў адзін з каардынатараў апытання, вынікі паказалі, што жыхары інтэрнатаў пазбаўлены нармалёвых умоваў жыцця:

– Шкада, што мы не маем магчымасці звярнуцца ў Камітэт дзяржаўнага кантроля, каб яго службоўцы праверылі, куды ж расходуюцца велізарнейшыя грошы, якія студэнты плоцяць за сваю адукацыю. І чаму іх не хапае на тое, каб забяспечыць інтэрнатаўцам нармальнае жыццё.

Бліжэйшым часам «Дзедзіч» правядзе апытанне інтэрнатаўцаў тэхнічнага універсітэта, каб параўнаць, дзе ж жывецца лепей.

**Павел ДАЙЛІД**



**«Дзяржынка». Чарга ў душ**

## АДНЫМ РАДКОМ

### ЦЭНТР РЭАБІЛІТАЦЫІ ДЛЯ НАРКАМАНАЎ БУДЗЕ

У Берасці распачата падрыхтоўчая праца па стварэнні рэабілітацыйнага цэнтра для нарказалежных.

Аб гэтым паведаміла кіраўнік Берасцейскага абласнога аддзялення рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Маці супраць наркотыкаў" Таццяна Мяшковіч на пасяджэнні круглага стала, прысвечанага праблемам нарказалежнасці. Мерапрыемства было прымеркавана да міжнароднага Дня барацьбы з наркотыкамі.

Варта ўзгадаць, што на аналагічнай канферэнцыі, якая адбылася роўна тры гады таму, загадчык арганізацыйна-метадычнага аддзела абласнога наркадыспансэра Лідзія Бурбіцкая заявіла аб тым, што ў 2005г., згодна з рэспубліканскай праграмай, павінен быць адчынены рэабілітацыйны цэнтр для наркаманаў на базе Гарадзішчанскага псіха-неўралагічнага дыспансэра.

Пытанне аб неабходнасці стварэння такога рэабілітацыйнага цэнтра ставілася пачынаючы з 1998 года. ¨сць надзея, што на наступны Міжнародны дзень барацьбы з наркотыкамі, 1 сакавіка 2008г., справа нарэшце пачне рухацца.

На сённяшні дзень у Берасцейскай вобласці зарэгістравана 1.394 наркаманы, з іх прыкладна чвэрць складаюць хворыя на СНІД. Асноўны кантынгент – гэта моладзь ва ўзросце ад 17 да 25 год. З іх самастойна звяртаюцца за медыцынскай дапамогай адзінкі.

### АСАБІСТЫ ДАГЛЯД ЦЯГНУЎСЯ 12 ГАДЗІН

26 лютага ў 3-30 раніцы на памежным пераходзе "Макраны" на 11 гадзін быў спынены аўтобус накірункам Львоў – Менск, у якім з вандроўкі вярталіся дамоў студэнты і школьнікі старэйшых класаў, агулам 42 чалавекі.

Мытнікамі было знойдзена і канфіскавана некалькі дыскаў з фільмам "Плошча", што распавядае пра падзеі падчас і пасля прэзідэнцкіх выбараў 2006г. У адной з пасажырак забраны ноўтбук для праверкі інфармацыі, якая знаходзілася на ім.

На працягу 11 гадзін мытнікі трымалі моладзь на мяжы, не тлумачачы прычынаў. Па словах сведкаў, службоўцы, што праводзілі дагляд, увесь час з кімсьці кансультаваліся па тэлефонах.

Гэты выпадак не адзіны. Дагляды дэмакратычных актывістаў – не рэдкасць на беларуска-польскай і беларуска-украінскай мяжы.

Застаецца дадаць, што, адпаведна правілаў мытнай службы, на праверку і дагляд аўтобуса пры перасячэнні ім дзяржаўнай мяжы адведзена 20 хвілін.

### ХАДЗЕМ НА КІНАЛЕКТОРЫЙ?

Намеснік старшыні Берасцейскага аблвыканкама Леанід Цупрык выступіў з ідэяй вярнуцца да практыкі савецкіх часоў і перад сеансамі ў кінатэатрах дэманстраваць кароткаметражныя стужкі з ідэалагічнай прапагандай.

Гэтая ідэя была агучаная на выніковай калегіі ўпраўлення ідэалагічнай працы Берасцейскага аблвыканкама.

Акрамя гэтага сп. Цупрык прапанаваў ідэолагам падумаць аб выпуску газет накладам 299 асобнікаў, якія не патрабуюць рэгістрацыі, а таксама аб дастаўцы мясцовай прэсы нашым землякам-беларусам у суседнія рэгіёны Польшчы для прапаганды беларускай мадэлі кіравання.

**Dzedzich week-news**

# ХІТ-ПАРАД МАРАЗМАЎ

## ПЕРЫЯДУ ВЫБАРАЎ ПРЭЗІДЭНТА

### 5

Спыненне супрацоўнікамі ДАІ машыны, у якой знаходзіўся намеснік кіраўніка Берасцейскага гарадскога штабу А. Мілінкевіча.

Маразм: падставай для спынення машыны стаў "неакуратны аб'езд лужын (!)" і тое, што кіроўца, магчыма, п'яны. Зразумела, што прычына спынення была іншая, але супрацоўнікі ДАІ нават для прыліку не паклапаціліся пра тое, каб праверыць кіроўцу на спажыванне алкаголю, а адразу палезлі ў багажнік – шукаць улёткі. Відаць, проста забыліся.

### 4

Затрыманне кіраўніка Берасцейскага абласнога штабу А. Мілінкевіча, старшыні абласной арганізацыі партыі БНФ Юрася Губарэвіча.

Маразм: падставай для адміністрацыйнага затрымання (!) стала парушэнне Ю. Губарэвічам правілаў дарожнага руху: ён быццам бы не ўключыў святло аўтамабіля, калі пачынаў рухацца. Пасля супрацоўнікі ДАІ "не змаглі" расчытаць нумар кузаву аўтамабіля, з-за чаго Ю. Губарэвіч знаходзіўся ў Ленінскім РАУС каля чатырох гадзінаў у чаканні адмысловага эксперта па "расчытванні" аўтамабільных нумароў.

### 3

Абвінавачанне актывіста МФ Артура Фінькевіча ў злосным хуліганстве і пашкоджанні дзяржаўнай маёмасці за два графіці "Мы хочам новага" і "Достал". На судзе А. Фінькевіч патлумачыў, што надпісы рабіў падчас выбарчай кампаніі на знак пратэсту супраць таго, што ў СМІ ні слова не казалася пра кандыдатаў на пасаду прэзідэнта, апроч аднаго.

Маразм: суд прызначыў кошт за выдаленне двух надпісаў - 35 млн. рублёў. Такім чынам, кожную літару ацанілі ў 100 $. Чым не халяўная падстава для камунальных службаў спісаць грошы за капітальны рамонт на апазіцыянераў, якіх арыштавалі за графіці.

### 2

Затрыманне на Кастрычніцкай плошчы ўдзельніка мірных акцый пратэсту 19 – 25 сакавіка.

Маразм: цытуем пратакол: "Виновен в том, что не согласен с преследованием инакомыслия и наличием политзаключенных". Такім чынам, суд фактычна прызнаў наяўнасць такіх абставінаў і зафіксаваў нязгоду затрыманага. Вынік – 10 суткаў адміністрацыйнага арышту.

### 1

Затрыманне на Кастрычніцкай плошчы ўдзельніка мірных акцый пратэсту 19 – 25 сакавіка.

Маразм: цытуем пратакол: "Выкрикивал АНТИСОВЕТСКИЕ и антиправительственные лозунги "Живёт Белоруссия!", "Гоньба!", "Лукашенко - долой!" "Милицыя с народом!", "Верим. Можым. Пераможым"" (арфаграфія захавана). Без каментарыяў.

**ТОЕ, ШТО НЕ СМЕШНА:**

**Да 19 сакавіка па рэгіёнах – 236 затрыманняў.**

**З 19 па 25 сакавіка ў Менску – 686 затрыманняў.**

**[redacted]адрыхтавала Алена ДЗЕМІДЗЮК**

# ФЛЭШ-МОБ –

**АПОШНІМІ МЕСЯЦАМІ ЎСЁ ЧАСЦЕЙ МОЖНА ПАЧУЦЬ ПРА ЦІКАВЫЯ АКЦЫІ, ЧАСАМ З ЗАГАДКАВЫМ ЗМЕСТАМ, ШТО ЛАДЗЯЦЦА МОЛАДДЗЮ Ў РОЗНЫХ КУТКАХ НАШАЙ КРАІНЫ. НАПРЫКЛАД, ГРУПА МАЛАДЫХ ЛЮДЗЕЙ ПА ЧАРЗЕ НАБЫВАЕ АСОБНІК "СОВЕТСКОЙ БЕЛОРУССИИ", ПАСЛЯ ЧАГО, РАЗГАРНУЎШЫ, РВЕ І ВЫКІДАЕ Ў СМЕТНІЦУ. АЛЬБО КАЛІ НЕКАЛЬКІ ДЗЕСЯТКАЎ ЧАЛАВЕК ІМГНЕННА З'ЯЎЛЯЮЦЦА НА КАСТРЫЧНІЦКАЙ ПЛОШЧЫ ПРАЗ МЕСЯЦ ПАСЛЯ ЛІКВІДАЦЫІ НАМЁТАВАГА ЛАГЕРУ, СЯДАЮЦЬ НА ЯЕ, ДЭМАНСТРАТЫЎНА КРАНАЮЧЫСЯ ЯЕ РУКАМІ.**

Гэткім чынам моладзь пратэстуе супраць хлусні ў дзяржаўных СМІ, супраць беззаконня ўлады і парушэння правоў чалавека ў краіне.

## ГІСТОРЫЯ

Такога кшталту акцыі атрымалі назву "флэш-моб". Флэш-моб (у перакл. "імгненны натоўп") – хуткае з'яўленне ў пэўным месцы і ў пэўны час людзей, якія дзейнічаюць па загадзя вызначаным сцэнары.

Перадгісторыя падобных акцый апавядаецца ў кнігах фантаста Лары Нівена, што выйшлі яшчэ ў 60-я гг. мінулага стагоддзя. У сваіх кнігах аўтар выказваў ідэю збіраць людзей разам, што падобна да ідэі сучасных флэш-мобаў. Першы з такіх флэш-мобаў адбыўся ў Нью-¨рку, калі нейкі бізнесовец Біл разаслаў 50 электронных лістоў сваім знаёмым з просьбаю сабрацца ў адной з крамаў Манхэтана. Але гэтая спроба аказалася няўдалай, бо ўладальнік крамы спужаўся наплыву людзей і выклікаў паліцыю.

Класічны флэш-моб не нясе ніякага сэнсу, а мае выключна забаўляльны характар. У працэсе развіцця панятак "флэш-моб" стаў больш шырокім. У розных краінах гэтая з'ява набыла свой нацыянальны каларыт, выкарыстоўваюцца розныя спосабы інфармавання, акцыі носяць альбо забаўляльны характар, альбо набываюць іншыя рысы: мастацкасць, сацыяльнасць і г.д. Адрознасць флэш-мобаў у Беларусі - яскрава выражаны грамадска-палітычны падтэкст.

Пазбаўленая магчымасці свабодна выказваць думкі і адстойваць свае правы, моладзь самаарганізуецца на акцыі, якія носяць пратэстны характар. Асаблівасцю флэш-мобаў з'яўляецца і тое, што сама ідэя флэш-мобу абмяркоўваецца паміж яе ўдзельнікамі калектыўна, што не дае магчымасці знайсці арганізатараў. Часта месца і час правядзення становяцца вядомымі за некалькі гадзін да пачатку акцыі. Сам флэш-моб заўсёды хуткацечны, таму з'яўляцца на яго трэба дакладна ў вызначаны час. Эфект флэш-мобу - сумесныя дзеянні незнаёмцаў. Таму падчас флэш-мобаў непажадана вітацца і размаўляць паміж удзельнікамі, калі гэтага не патрабуе сцэнар.

## ПРАВІЛЫ

У адным з артыкулаў газеты "Наша Ніва" (№15;14 красавіка 2006г.), прысвечаным гэтай тэме, надрукаваны восем правілаў удзельніка флэш-мобу:

1. З'явіцца ў дакладна вызначаны час.
2. Не вітацца з астатнімі ўдзельнікамі.
3. Не вылучацца з шэрагу людзей, якія сабраліся.
4. Дзейнічаць толькі па плане.
5. Быць цвярозым і адэкватным.
6. Не трымаць аніякіх кампраметуючых, нават ускосна, рэчаў і прадметаў.
7. Дзейнічаць толькі ў межах закону і маралі.
8. Хуценька знікнуць пры канцы акцыі.

Найбольш масавы флэш-моб прайшоў у Менску 9 красавіка з нагоды палітычных рэпрэсій, што захлынулі краіну ў час выбарчай кампаніі і пасля яе завяршэння. Каля 500 пераважна маладых людзей ў вячэрні час сталі ланцужком з запаленымі свечкамі на набярэжнай, каб выказаць сваю салідарнасць з ахвярамі рэпрэсій.

Не адстаюць ад менскіх флэш-мобераў і берасцейскія. Берасцейскія флэш-мобы не збіраюць такой вялікай колькасці людзей (што цалкам лагічна), але па якасці і арыгінальнасці не саступаюць менскім. А па колькасці праведзеных флэш-мобаў дык і ўвогуле Берасцю няма роўных.



Флэш-моб салідарнасці з палітычнымі вязнямі, які адбыўся ў Менску каля Вострава слёз на беразе Свіслачы. Каля 50 чалавек спускалі на ваду папяровыя караблікі з імёнамі палітвязняў. 4 красавіка 2006г.

Фота: ByMedia.net

# ГЭТА ШТО?



**Флэш-моб у Берасці ў абарону газеты «Наша Ніва», якую ўлады спрабуюць зачыніць. Каля 50 маладых людзей стаялі ўздоўж праспекта Машэрава, чытаючы «Нашу Ніву». На спіне кожны з удзельнікаў меў літару, якія разам складалі тэкст «Барані Нашу Ніву». 21 траўня 2006г.**

## А ЯК У НАС

Іранізуючы з тэмы беларуска-расейскага газавага канфлікту, мясцовыя актывісты пранеслі перад расейскай амбасадай імправізаваны трубаправод з надпісам «"Белтрансгаз" не аддамо!».

Узгадаўшы тэму берасцейскіх судоў, якія "заплямілі" свой гонар, выдаючы выракі мясцовым грамадскім актывістам падчас выбарчай кампаніі, берасцейскія флэш-моберы вырашылі зладзіць акцыю "Чысты суд". Прыхапіўшы з сабой венікі, шчоткі ды ганучкі, яны абмылі будынак суду ад бруду як у прамым, так і ў пераносным сэнсе, выклікаўшы непамернае здзіўленне тутэйшага ахоўніка, які не ведаў як рэагаваць на "цімураўцаў".

Нечуваная па працягласці акцыя "Варта маўчання" прайшла ў Берасці на знак падтрымкі маладзёнаў, якія трымалі у розных кутках Беларусі галадоўку. Роўна на працягу сутак актывісты кампаніі "За свабоду" чыталі Біблію на плошчы Леніна, паперамена змяняючы адзін аднаго.

Недахоп ідэяў флэш-моберы не адчуваюць і гэтыя ідэі пераўтвараюцца ў новыя мерапрыемствы, што ўзнікаюць у той ці іншай частцы горада і прыносяць асалоду ўдзельнікам і абуджаюць цікавасць у назіральнікаў.

## А Ў ЧЫМ СЭНС?

Кожная "ўспышка натоўпу" ўтрымлівае ў сабе нейкі схаваны сэнс, прычым кожны раз новы. Але ці бачаць гэты сэнс астатнія?

У сувязі з гэтым мы вырашылі даведацца, ці чулі людзі пра такую з'яву як "флэш-моб" і што яны ведаюць пра яго, ці бачылі ў нашым горадзе і як ставяцца да людзей, што ўдзельнічаюць у ім. Каб атрымаць адказы на гэтыя пытанні, мы выйшлі на вуліцы нашага роднага горада з невялічкім апытаннем, у якім прынялі ўдзел 57 чалавек. Асноўную частку з іх склалі студэнты гуманітарных факультэтаў.

Аказалася, што яны маюць розныя ўяўленні пра флэш-моб і яго прызначэнне:

– штосьці звязанае з музыкай (2 адказы),
– з мабільнымі тэлефонамі (3),
– нешта моладзевае (6),
– здымкі, фотасесія (2),
– акцыя з невядомай для апытаных мэтай (8),
– моладзевая арганізацыя, маючая пэўныя мэты (6),
– від негвалтоўнай барацьбы супраць улады (3).

Некаторыя выказалі меркаванне, што гэта сайт, дэманстрацыя, спаборніцтвы, дыскатэка. Аднак 23 чалавекі (40% апытаных) не маюць ніякага ўяўлення пра тое, што такое флэш-моб.

Разам з гэтым можна адзначыць, што з апытаных ў флэш-мобах удзельнічала 6 чалавек, бачыла флэш-моб – 8 чалавек, чула пра яго – 3, адзін апытаны прызнаўся, што чытаў сцэнары на сайце, але яны яго не прывабілі (што ж, прапануйце свае ідэі!). Астатнім удзельнікам апытання (39 чалавек) не давялося паўдзельнічаць ці пабачыць флэш-моб.

Многія (37 чалавек) не вызначыліся ў сваім жаданні паўдзельнічаць у флэш-мобе, 7 чалавек адназначна адказала "не", 3 адказала, што гэта залежыць ад падзеі, да якой прымеркаваны флэш-моб. Пагадзіліся прыняць удзел 10 апытаных.

Што тычыцца стаўлення да ўдзельнікаў флэш-мобаў, то тут не абышлося без сарказму і проста глупства: "...я хаджу за імі па пятах, але яны не бяруць мяне да сябе ў секту!!!". Але ў цэлым стаўленне да флэш-мобераў альбо "аніякае" (61%), альбо станоўчае (33%). Вось найбольш яркія адказы: "Рознае стаўленне. Нехта ўдзельнічае дзеля ідэі, нехта - проста за кампанію, каб вылучыцца"; "Я лічу, што кожны павінен змагацца за вартае жыццё ў нашай краіне".

Можна сцвярджаць, што ў нашым горадзе яшчэ мала хто ведае, што такое флэш-моб і навошта ён патрэбны. Аднак частка людзей мае ўяўленне пра флэш-моб і нават удзельнічала ў ім.

**Віталь КОЎШ,**
**Юлія і Кацярына ПАШКО**

## АЎТАРЫТЭТНА

**Дзмітрый ШЫМАНСКІ,**
**Старшыня Рады Берасцейскай гарадской арганізацыі Партыі БНФ**

– Некаторыя палітыкі кажуць, што ад флэш-мобаў няма ніякай карысці. Быццам бы яны накіраваны толькі на тое, каб пазабавіць ці дадаць порцыю адрэналіну самім удзельнікам. Катэгарычна не згодзен з такім меркаваннем!

Па-першае, флэш-мобы – амаль адзіная магчымасць для дэмакратаў наладзіць камунікацыю з грамадствам ва ўмовах фактычнай адсутнасці незалежных СМІ. Праз іх мы даносім да людзей праўду пра актуальныя праблемы жыцця грамадства.

Па-другое, не трэба думаць, што пра флэш-моб будзе ведаць толькі сотня-другая мінакоў, якія яго выпадкова пабачаць. Праз інтэрнэт і тыя газеты, што яшчэ засталіся, пра яго даведаецца вельмі шмат людзей.

І самае галоўнае, людзі, якія хаця б раз выйшлі на паспяховы флэш-моб, назаўсёды вынішчаюць у сабе страх. Аказваецца, нікога не выключаюць з ВНУ ці з працы, не ціснуць на бацькоў. Арганізатарам толькі трэба правесці ўсё так, каб нікога не затрымалі. І збольшага ў берасцейскіх флэш-моберау гэта атрымліваецца.

Мы аказваем і будзем надалей аказваць усю магчымую арганізацыйна-тэхнічную і прававую дапамогу ў правядзенні падобных мерапрыемстваў. Што да сябраў Партыі БНФ, то я заклікаю ўсіх партыйцаў далучацца да ўдзелу ў флэш-мобах.

## РЭЙТЫНГ НЕБАРАКІ

# ПАД ПРЫЦЭЛАМ – БРДУ

### 5 ЛІФТЫ

Дзесьці паміж сёмым і першым паверхамі ён пачынае тармазіць і нарэшце спыняецца. Дзверы не адчыняюцца. Палова народу пачынае скакаць ад такога падарунку лёсу, а мне не вельмі смешна – спазняюся на "фіз-ру" у "Дынама". Складана знайсці студэнта з новага корпусу, які б хоць раз не апынуўся ў падобным становішчы. І яшчэ больш складана ўзгадаць дзень, калі б дакладна працавалі ўсе тры ліфты.

### 4 МЕДПУНКТ

Погляды на працу гэтай "гарачай кропкі" універсітэту двайстыя. Першых задавальняе ўсё, але яны, мабыць, бываюць там толькі падчас медагляду. Другія ж скардзяцца, і ў асноўным, на складанасць атрымання даведкі, нават аб звальненні ад адной пары фізічнай культуры. Гаворыць, каб яе займець, абавязкова трэба прыйсці з павышанай тэмпературай, а інакш можаш і не сунуцца. "А я лёгка атрымаў даведку, – дзеліцца са мной сакрэтам М., – набіў тэрмометр аб калена і ўсё!". Але ж гэта не выйсце. Трэба звярнуць увагу медперсаналу на тое, што тэмпература чалавека не заўсёды з'яўляецца паказчыкам яго здароўя.

### 3 СТАЛОЎКА

Лепей бы яе і зусім не было. Амаль кожны раз, калі хочаш нармалёва паабедаць, там атрымліваецца такая чарга, што адразу знікае і апетыт, і настрой. Таксама хлопцы скардзяцца на тое, што абслугоўваючы персанал налівае мала першага і накладвае мала гарніру: "З адной-дзвюх талерак я не наемся, але дзесяць не вазьму, бо сорамна". Павагай карыстаецца толькі адна "старая бабулька", як яе называюць студэнты, яна ніколі не баіцца пераліць галоднаму чалавеку. Лаўкі з булкамі на першым і чацвёртым паверхах не асабліва выратоўваюць становішча. Там таксама страціш перапынак, каб узяць які-небудзь смажань, калі, канешне, пасля гэткага натоўпу ён яшчэ застанецца.

### 2 ПРЫБІРАЛЬНЯ

Асабліва востра гэтая праблема паўстае ў старым корпусе. Калі для выкладчыкаў існуе асобная прыбіральня, то простым студэнткам трэба раней сыходзіць з пар, каб заняць месца ў чарзе. "Бывае, прастаім увесь перапынак, ды яшчэ і на пару спазнімся", – скардзіцца Алена, студэнтка пятага курса. Трэба тэрмінова вырашаць праблему: ці павялічыць колькасць "ачкоў", ці паменшыць колькасць дзяўчат у старым корпусе. Не трэба забываць, што і ў новым корпусе часам паўстае тая ж сітуацыя. "Мы з сябрам прыйшлі – чарга, вельмі спяшаліся, таму непрыгожа ўціснуліся перад адным хлопцам. А што рабіць?" – каментуе трэццякурснік Міхаіл.

### 1 МІНІ-ПАРК

Большасць навучэнцаў амаль не "калыша", навошта падрыхтавалі гэты палісаднік са сцежкамі каля галоўнага корпуса, па якіх ніхто не ходзіць, і з лаўкамі, на якіх ніхто не сядзіць. Але некаторыя проста абураюцца: "Ды яго адчыняюць толькі для VIP-персон!". Можа, адміністрацыя універсітэта проста не давярае сваім студэнтам і лічыць, што калі запусціць іх у парк, то ад яго нічога не застанецца? Шкада рэдкіх раслін, новых пафарбаваных лавак...

**Вікторыя МАМУТА**

## АДНЫМ РАДКОМ

### У КОБРЫНЕ ШАНУЮЦЬ АЛЯКСАНДРА СУВОРАВА

У Кобрыне працягваецца будоўля храма-помніка ў гонар Аляксандра Суворава.

Гэта ўжо не першая спроба пабудаваць у горадзе царкву ў гонар расейскага ваякі, які для беларусаў, у першую чаргу, асацыюецца з задушэннем паўстання Тадэвуша Касцюшкі. За гэта імператрыца Кацярына II і перадала Кобрын ва ўласнасць Аляксандру Сувораву.

Упершыню ідэя пабудовы царквы-помніка Сувораву ўзнікла ў пачатку XX стагоддзя. Пры Мікалаі II быў абвешчаны агульнарасейскі збор сродкаў на рэалізацыю праекта. Але тады будоўля не была закончаная.

Зараз ідэя будаўніцтва царквы таксама знайшла падтрымку ў Расеі. Маскоўскі патрыярх Аляксей II распарадзіўся аказаць матэрыяльную дапамогу на будаўніцтва.

Ініцыятары будоўлі – мясцовы святар Мікалай Лукашык і старшыня апекунскай рады па будаўніцву царквы Мікалай Кожух, – сцвярджаюць, што грошы на будоўлю прыходзяць з розных крыніц, у тым ліку з бюджэтных фондаў. На гэтыя сродкі ўдалося завяршыць закладку падмурка і часткова ўзвесці сцены цокальнага паверха.

Нагадаем, што ў Кобрыне дзейнічае музей Аляксандра Суворава. У музеі толькі нядаўна з'явілася невялічкая экспазіцыя, якая распавядае пра ягонага праціўніка, героя беларускага народу Тадэвуша Касцюшку.

**Dzedzich week-news**

### ГРАМАДСКАСЦЬ СУПРАЦЬ УШАНАВАННЯ СУВОРАВА

Прадстаўнікі грамадскасці пачалі кампанію супраць будаўніцтва ў Кобрыне храма-помніка Аляксандру Сувораву.

Па ініцыятыве міжнароднага грамадскага аб'яднання "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" ў Кобрыне пачата акцыя супраць будаўніцтва храма-помніка расейскаму вайскаводцу Аляксандру Сувораву. Пра гэта паведаміла старшыня савета ЗБС "Бацькаўшчына" Алена Макоўская.

Як адзначыла А.Макоўская, ацэнка дзеянняў Суворава на беларускай зямлі адназначная: менавіта пад яго кіраўніцтвам надзвычай жорстка душыліся народныя паўстанні канца XVIII стагоддзя, у тым ліку і паўстанне Тадэвуша Касцюшкі, якім сёння ганарыцца Беларусь. Пад кіраўніцтвам Суворава ажыццяўляліся злачынствы супраць беларускага народа. Сувораў на штыках прынёс прыгонпае права ў Беларусь. Таму "Бацькаўшчына" выступае супраць будаўніцтва храма-помніка, які ў вачах беларусаў стане сімвалам апраўдання кравапраліцця.

Да кампаніі пратэсту далучыліся грамадскія аб'яднанні "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" (ТБМ) і "Саюз беларускіх пісьменнікаў". 20 лютага прадстаўнікі трох грамадскіх аб'яднанняў звярнуліся з адкрытым лістом да мітрапаліта Філарэта з патрабаваннем спыніць будаўніцтва храма-помніка. Аналагічныя звароты накіраваны прэм'ер-міністру Сяргею Сідорскаму, упаўнаважанаму па справах рэлігій і нацыянальнасцей Леаніду Гуляку, а таксама кіраўнікам выканаўчай улады Берасцейскай вобласці і горада Кобрына. "У найбліжэйшы час плануецца пачаць шырокую кампанію па збору подпісаў у падтрымку нашых патрабаванняў", – паведаміла А.Макоўская.

**Dzedzich week-news**

## ДЗМІТРА ДАНЦОЎ

# РАСЕЯ



**ВАШАЙ УВАЗЕ ПРАПАНУЮЦЦА ЎРЫЎКІ З АРТЫКУЛА, ЯКІ ПАБАЧЫЎ СВЕТ ЯШЧЭ Ў МІЖВАЕННЫ ЧАС. АЎТАР ЯГО, ВЯДОМЫ ЎКРАІНСКІ ЛІТАРАТУРНЫ КРЫТЫК ДЗМІТРА ДАНЦОЎ, ПАДЫМАЕ ПЫТАННЕ, НА ЧЫЮ КУЛЬТУРУ, А Ў ПРЫВАТНАСЦІ – НА ЛІТАРАТУРУ (А Ў ЛІТАРАТУРЫ, ВЯДОМА, АДБІВАЕЦЦА СВЕТААДЧУВАННЕ НАРОДА), МАЕ АРЫЕНТАВАЦЦА ЛІТАРАТУРА ЎКРАІНСКАЯ, НА ЧЫМ МАЕ ГАДАВАЦЬ МОЛАДЗЬ.**

**ПЫТАННЕ, ГЭТАЕ НЕ СТРАЦІЛА АКТУАЛЬНАСЦІ І ЦЯПЕР, І НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ ЎКРАІНЦАЎ, АЛЕ І ДЛЯ НАС. АДКАЗ АЎТАРА АДНАЗНАЧНЫ – НА ЕЎРАПЕЙСКУЮ. АРГУМЕНТАЦЫЮ ГЭТАГА ТЭЗІСУ ВІДАЦЬ З УРЫЎКАЎ ЯГОНАЙ ПРАЦЫ, ЗМЕШЧАНЫХ НІЖЭЙ.**

[…] Еўропа і Расея – гэта два культурныя кантыненты, раздзеленыя акіянам узаемнага непаразумення. Яно адбіваецца і ў літаратурнай творчасці. Вось чаму апраўдана так ставіць пытанне – з Масквою ці з Еўропай, прычым пад Еўропай разумею тут краі акцыдэнтальнае культуры, вось жа і Амерыку.

Што такое Еўропа? Гэта кантынент, які ў кольксотлетняй вайне адбіў чужынскую навалу і заваяваў тры іншыя кантыненты цалкам, а чацвёрты (Азію) ў значнай частцы.

Гэта мусіць быць, вось жа, незвычайная раса людзей! […]

І калі мы звернемся да літаратуры акцыдэнту, то якраз у ёй знойдзем усе характарыстычныя рысы еўрапеізму. Ці то ў постаці Дон Кіхота, Фаўста, Дон Жуана, Чайльд Гарольда, Бранта, Валенштайна ці Макбета – і аж да Св. Іаанны, Б. Шоў, да "апантаных" Бернаноса ці "дэспeрадас" Ібаньеза, – скрозь знойдзеце вы той дух гераізму, якога найпершаю рэччу на свеце ёсць – змаганне, рост і перамога. […]

Чым была супраць гэтай Еўропы Расея? Расея была правінцыяй, а яе літаратура – правінцыйнаю літаратурай. Во што пісаў пра гэта Бялінскі: "Расея жыла ізаляваным жыццём, чужая інтарэсам людства", звязаная з імі адно "механічна". Народы гальска-рымска-тэўтонскае фармацыі мелі «унутранагістарычнае значэнне, выражалі сваім жыццём ідэю". Турка-татары і Расея гэтае ідэі не мелі, яны дзеялі ў гісторыі адно "сілаю свайго прыцягнення", масаю: народы-намады!» І таму "сусветна-гістарычнага значэння расейская літаратура ніколі не мела", – кажа Бялінскі. "Байран і Шылер займаюць пэўнае азначанае месца ў гістарычным развоі людства... А дзе месца Пушкіна?.. Не менш за Байрана і Шылера вялікі, ён, тым не менш, мог бы і не быць..., а ў гісторыі людства не паўстала б праз гэта ніякае паражнечы". […] [В. Белинский – "Литерат. Мечтания, Русская литература в 40-х годах".]

Глыбокія ідэі і глыбіню зместу адбівае адно грамадства з напружаным, афарбаваным, разнародным жыццём. Расея не была такім грамадствам.

У гэтым сэнсе і гаварыў Чаадаеў, што Расея не дала свету ніякай новай ідэі, ні ў чым не спрычынілася да людскога прагрэсу. Дый як яна магла якуюсьці ідэю даць? Носьбітам усякае ідэі ёсць свабодная індывідуальнасць. Свабодная індывідуальнасць была на Захадзе, але Расея не знала яе. […] Таму на Захадзе вытварыўся тып незалежнага чалавека, у Расеі ж, як кажа Бакунін, – тып "раба і дэспата" адначасна. Прыкметы маскаля, пацвярджае В.Салаўёў, – "произвол і раболепство". Якраз гэты тып пераважае ў літаратуры расейскай.[…]

Наогул, тып, што пануе ў расейскай літаратуры, гэта тып бязвольнага чалавека, а мае ён там невычэрпны запас нюансаў. "Расейскія класікі, – піша наш сучаснік, расейскі прафесар Яшчанка, – па сутнасці, не класікі, бо няздатныя ўзгадаваць моцных, энергічных, маральна здаровых людзей; што характарызуе герояў нашай літаратуры? Маральная слабасць і жаданне апраўдаць гэтую слабасць заганамі самога жыцця... Летуценні пра будучыню і поўная нездатнасць ужыццявіць гэтыя летуценні ў цяперашчыне, няздольнасць да чыну, да творчага ходання. Чацкі Грыбаедава, што ўцякае перад агідаю жыцця... Рудзін ды іншыя Гамлеты Тургенева, Абломаў і Райскі Ганчарова – бясплодныя балакуны і дзяньгубы, эпілептыкі Дастаеўскага, звіхнутыя істоты Чэхава, "лішнія людзі", вось тыпы літаратуры расейскае.

Гэта людзі без уласнае волі, што без прынукі звонку "кроку не зробяць".

"Русскій человек, – пісаў Гогаль у "Мёртвых душах", – не может без понуканія... Русскій человек какой-то пропашчій человек... Хочешь всё сделать і нічего не можешь. Всё думаешь, с завтрашнего дня нашнёшь новую жізнь, с завтрашнего дня сядешь на діету. Нічуть не бывало. К вечеру того же дня: так об'ешься, что только хлопаешь глазамі і язык не ворочается – как сова сідішь, глядя на всех". Вось уключная характарыстыка ўсіх Рудзіных літаратуры расейскай. Шмат хочуць і нічога не могуць. Непамерны апетыт – і ніякае волі. Абнаўленне цэлага свету ў праекце – і "хлопаніе глазамі" ў рэальнасці.

На Захадзе чалавек не шукаў апраўдання сваіх няўдач па-за сабою.

[…] За ўсякі ляпсус няўдачнікаў робіць расейская літаратура адказным асяроддзе! Не караць недарэкаў, а шкадаваць іх трэба – светапогляд Чэхава, Ганчарова, Дастаеўскага. Усе кропкі над "і" паставіў, відавочна, Леў Талстой. ¨н проста адмаўляе за здольнасць асягнуць нешта собскімі намаганнямі. Героі Талстога – гэта негацыя самога паняцця гераізму. Яго ідэі – гэта немагчымасць, непатрэбнасць, безвыніковасць і неэтычнасць ходання са светам. Актыўнасць у яго – адмоўная рыса, пасіўнасць –станоўчая.

І нават тады, калі гэтыя "лішнія людзі" зрываліся да бунту, усё канчалася фарсам. У заходняй літаратуры бунт – зыркі і моцны. У расейскай – баязлівы і скрыты. Як кажа Вс.Іваноў: "Русскіе бунтуют грязно, кроваво і однообразно. Даже убівают ілі ізза угла ілі топят" [В. Іванов – "Голубые пески"]. Як Смердзякоў, як Раскольнікаў, як бальшавікі...

# ЦІ ЕЎРОПА?

На Захадзе бунт дамэтны і зыркі. Вазьміце д'ябальскія постаці Барбей д'Арэвілі, зверабояў Мантэрляна, вазьміце Ватрэна Бальзака або бандытаў Мэрымэ, – нават у сваім граху гэтыя асабістасці непакорныя да астатку. Расейскія ж бунтаўнікі, кажа Дастаеўскі – "бунтовшчікі слабосильные", "собственного своего бунта не выдерживающчіе"... […]

І улюбёныя героі Дастаеўскага – гэта не бунтаўнікі, толькі "уніженные і оскорблённые", або "пакутнікі" […] (Макар Дзевушкін, Нэллі, Князь Мышкін).[…] У прадмове да твораў Дастаеўскага (выд. "Нівы") апавядае К.Случэўскі паводле слоў К.Аксакава: "у яго сядзеў аднойчы Дастаеўскі і вёў размову пра цара Мікалая І, пра якога гаварыў з найбольшаю пашанай. Увайшоў Мэкэнзі Уолес, вядомы ангельскі пісьменннік. Дастаеўскі гаварыў далей пра цара. Калі ён пайшоў, Уолес спытаў Аксакава: "Ці гэта аўтар "Мёртвага дому"? – Так. – Не можа быць! Дык ён быў засланы на катаргу? – Быў, ну і што з таго? – Ды як жа ён можа хваліць чалавека, які паслаў яго на катаргу? – Вам, чужніку, гэта цяжка зразумець, адказаў Аксакаў, але нам гэта зразумела, гэта рыса цалкам нацыянальная..."

Вось ёсць генезіс пакаяннікаў Дастаеўскага "собственного бунта своего не выдерживающчіх", цалуючых руку таго, хто іх катуе. Найбольш не церпіць расеец "нераскаянности". "Что такое нераскаянность? – пытаецца Шчадрын, і адказвае – гэта тое, за што засылалі на Сібір памешчыкі сваіх сялян: "Секлі іх значіт, ну, а оні замест того, чтобы благодаріть за науку, совсем значіт нікакого чувствія... Это было последнее слово крепостного хішчнічества. Получайте в зубы і да велічіт душа моя!" ("Хищники"). […] Гогаль ["Выбранные места из переписки с друзьями", письмо Х.] ужо падглядзеў, што ў літаратуры расейскай няма "ненавісті к преступніку, нет даже донкіхотского порыва сделать із него героя". ¨сць толькі жаданне "утопіть несчастненького": стаўленне спачуваючых, але пасіўных і маральна зусім парожніх душ, што не ў стане здабыцца на актыўнае, пазітыўнае ці негатыўнае, стаўленне да людзей і да свету... "К добру і злу постыдно равнодушен".

Мне скажуць: вы забываецеся пра пачуццё міласэрнасці, спачуванне прыніжаным і пра тое новае слова, якое прынесла расейская літаратура! Але ж гуманнасць не ёсць асаблівасцю расейскай літаратуры! Ці Захад не знае Віктора Гюго, адваката прыгнечаных, апостала братэрства? Ці Захад не знае аўтара "Олівера Твіста" або "Хаціны дзядзькі Тома"? Лямартына? Або Заля?

Але ў іх які жа ж іншы акцэнт! Эмоцыі, каторыя будзяць у нас то эмоцыі спачування да бунтаўніка, помсты за крыўду, або ў кожным разе актыўнае жаданне яе паправіць. У расейцаў – адно гіпертрафаваная расчуленасць і сентыментальная гістэрыка. […]

Каб лепей паясніць гэтую думку, зраблю малое адступленне ў сферу толькі з выгляду іншую. Вось што піша Рамэн Ралан пра найрэпрэзэнтатыўнейшага прадстаўніка акцыдэнтальнай культуры – пра Бетховета (у кнізе пра яго): "[…] Слухачы рыдалі, калі ён граў. Але калі ён, скончыўшы, пазіраў на струменьчыкі слёз, ён ускідваў плячыма, і, смеючыся ім у твар, мармытаў да сябе: "Блазны... Тож мастацкія натуры?! Мастакі палаюць, але не плачуць!" ¨н быў поўны пагарды да сентыменталізму: "Толькі без узрушэнняў, казаў ён, разлучаючыся з прыяцелем. Цвёрда і мужна мусіць чалавек глядзець у вочы рэчам! ¨н перамагае іх, смела заглядае ім у вочы і ён смяецца..." […]

Смяецца тым смехам і Джэк Лондан. Яму галоўнае: "Не страшна памерці, страшна даць скрываўленаму целу завалодаць душою, страшна скавытаць і крычаць, агаляць – з плебейскаю бессаромнасцю – свае цялесныя або душэўныя раны перад натоўпам ("Бог ягоных бацькоў"). Гераіня Джэка Лондана "The little Lady of a big House" Паоля кажа пра свайго мужа: "¨н такі цвярды. Вытрымае якую хочаце буру... Яго ніхто яшчэ зроду не мог паставіць на калені... Я не хацела б гэтага бачыць. Я б памерла з сораму, калі б хтосьці пашкадаваў Дыка!"... Маскоўскія аўтары абярняся ставяць сваіх "герояў" на калені і не саромеюцца таго. Наадварот, думаюць, што спаўняюць тым якуюсь місію. Змагацца з доляю да белай крыві, але не выказваць перад ёю свае чалавечае слабасці – вось псіхалагічнае настаўленне пісьменнікаў акцыдэнту, вынесенае імі з бурлівай гісторыі іх кантыненту. І якраз гэтае мужнае рысы не стае пісьменству маскоўскаму.

"Мастакі гараць, не плачуць!" – паўтарала за Бетховенам заходняя літаратура. І таму аддала столькі мастакоў, якія змушаюць і нас не плакаць, – гарэць. Расейцы першым заданнем мастацтва ўважаюць "узрушыць", выціснуць слязу. […] Вось жа таму ў расейскай літаратуры багата галашэннікаў і мала мастакоў...

Што найцікавейшае, гэта тое, што галашэнні гэтых галашэннікаў засталіся бясплоднымі, не былі пачаткам пратэсту. М. Горкі ў рамане "Сярод чужых людзей" апавядае пра расейскую манію дыскусій. ¨н чуў, як людзі наўкола яго наракалі: "Жыццё наша нічога не варта, мы павінны лепей жыць. Але адначасна бачыў я, піша ён, што гэтая туга па лепшым жыцці зусім не прынукала іх штосьці змяніць у абставінах, сярод якіх яны жылі... Дыскутавалі пра новае або пра тагасветнае жыццё, а жылі ў брудзе і свінстве, пальцам не ківаючы, каб гэтае жыццё зрабіць трошкі знаснейшым нават там, дзе гэта было вельмі лёгка зрабіць"...

Такі быў тып расейца ў жыцці, такі і ў літаратуры: расчулены славаблуд і дзяньгуб, "тряпічная душа". Той самы Горкі пісаў ў іншым месцы: "Расеец захапляецца энергіяй, але не вельмі верыць у яе. Пісьменнік актыўнага настрою, напр., Джэк Лондан, немагчымы ў Расеі".

Няма гэтага актыўнага настрою і ў самога Горкага. Чукоўскі так піша пра яго: "...Яго (Горкага) увесь светапогляд збудаваны на гэтым адзіным дагмаце: чалавек – гэта істота, пакрытая язвамі. Трэба вылечыць гэтыя язвы, бо няма нічога вартоўнейшага на свеце, як гэты калека, што плача і стогне..." […] "Шчасце толькі ў шкадаванні. Не судзіце, а прабачайце. Нам трэба лекараў, а не суддзяў. Абвінавачваць не можна нікога!" ["Речь"] А вось што казаў Дастаеўскі: "Я думаю, што найгалоўнейшая патрэба расейскага народу – гэта патрэба пакутавання, скрозь і ўва усім". Патрэба, скажу я, выстаўляць напаказ свой боль, прасіць ласкі, як прыкасцёльныя старцы, што выстаўляюць напаказ свае скручаныя пальцы і абрубаныя ногі. Што гэта ёсць? Гэта – апафеоз калецтва, гэта бунт нікчэмнага супраць дужага, інэртнага супраць творчага, вырадаў супраць здаровых, супраць тых, якія не каюцца і не гнуцца, бунт хаосу супраць уцелаўлення, смерці супраць жыцця".[…]

Для амерыканца і еўрапейца перамowжаны – гэта недалуга і баязлівец, для маскаля – гэта той, каго трэба паставіць на першае месца, "вывесці на сухенькае" і сошкамі падперці, каб не пахіліўся.

[…] Масарык, што няраз сустракаўся з Талстым, апавядае ва ўспамінах пра яго (у Prager Presse 9.IX.1928): "Талстой бачыў у брудзе пэўную заслугу. Казаў, што хрысціянства ёсць і павінна быць вашывае (verlaust) ды што вашывы чалавек быў яму мілейшы за фізічна чыстага". […]

А за апрасцелым графам і іншыя... "Хто стаіць вышэй, – пытаўся Міхайлоўскі, – непісьменны дзяцюк Федзька ці Фаўст? Дзяцюк Федзька, бо Фаўст гэта чалавек "з звыраднелымі пачуваннямі", а Федзька – чалавек гарманічны..."

Што важней, пісаў Пісараў, чобаты ці Шэкспір? Чобаты, адказваў ён, бо іх карыснасць відавочная... Так апафеоз масы прывёў да апафеозу прымітывізму, некультурнасці ў літаратуры расейскай. Не цягнуць масу ўгору, а самому да яе знізіцца. Наесціся, напіцца, у лапці абуцца – вось што адзіна ёсць на патрэбу. Засталае ж – танцы, Фаўст, Венера і піраміды, чыстая сарочка і кёльнская вада, і Напалеон – "буржуазные предрассудкі"... […]

Заходняя літаратура прапаведвала самасцвярджэнне адзінкі, момант волі, чыннага фармавання хаосу, імкненне ўгару, шляхетнасць і парыў... Расейская – адмаўленне волі, дэперсаналізацыю, агульную нівеляцыю, прымітывізацыю патрэб, хаос, нірвану без руху і жаданняў, без стасцей... […]

Пра Талстога пісаў В.Разанаў, што святасць, якую прапаведуе аўтар "Крэйцэравай санаты", – гэта "святость поблекшіх шчёк, увядшіх мускулов, ідеал міра с вырваным із него хребтом, с потухшім взором", гэта – "поэзія померкшей весны", гэта "слепое вырываніе із міра его всеожіўляюшчего нерва", гэта "необузданная словесная любовь – без любві реальной, радостной і свободной". ["Религия и культура", Спб. 1889]

Слядамі гэтай старой расейскай літаратуры пайшла новая. Перадусім тая, што надавала тон расейскаму духоўнаму жыццю ў першых гадах нашага стагоддзя аж да вайны. Анненскі, у якога з'явы жыцця ўкрытыя букетам смерці; Брусаў, якому рэальнасць – гэта сон; А.Талстой, што, як Герцэн, кліча гунаў будучыні, каб абярнуць у бязладдзе жыццё... Салагуб. Нішто для яго найвышшае дабро. […] Талстой прапаведваў "неделаніе", даючы філасофскае абгрунтаванне абломаўшчыны. Герой Салагуба казаў, што "быть счастлівым значіло нічего не делать і, замкнувшісь от міра, ублажать свою утробу"... Другі герой таго самага аўтара "собірался опроститься і с этой целью прісматрівался, как мужікі сморкаются, чешут в затылке... і сам на деле подражал ім іногда"... Стары ідэал расейскай культуры! […]

Расейская сірэна грае на найменш адпорных струнах нашага сэрца. Яна небяспечная, прыгожая, прывабная – асабліва для бесхрыбетнае славянскае душы. Але нядобра доўга заставацца ў яе абдымках: яны размякчаюць мазгі, знясільваюць мускулы, расслабляюць волю...

Наша літаратура хворая. Нас доўга кармілі сваім зеллем розныя, часам вялікія, але ўсё ж правінцыйныя варажбіты з Масквы і Ленінграда. І замест вылечыць, выкрывілі нашу псіхіку. […] Калі наша літаратура хоча […] душу [нацыі] аздаравіць, мусіць яе перагатапіць у агні і жалезе тае культуры еўрапейскае, у якой выказвалася бліскучая і моцная душа еўрапейца, якая любіць фармаваць жыццё подле свайго ўпадабання... […]

Не вызвалімся палітычна, калі не вызвалімся духоўна. Пакуль не адчэпім ад сябе слізкіх лап таго спрута, што завецца культурай Усходу, а які забівае ў нас самы нерв жыцця, ахвоту да яго.

***"НАША ДОБА І ЛІТЕРАТУРА"***
***(накладам "Вісніка" Львоў 1936. Друкавана перад тым у ЛНВ 1929, І)***

**Пераклад Юркі АГІЕВІЧА**

# ДЗЕСЯЦЬ СУТАК НЯВОЛІ – НІШТО Ў ПАРАЎНАННІ З ЧАТЫРМА ДНЯМІ СВАБОДЫ

Зусім нечакана ў самай глыбіні таталітарызму ўзнік невялічкі астравок свабоды, якой так не хапае вольнадумцам нашай маленькай супердзяржавы. Сотні самаадвержанцаў ужо чацвёртыя суткі адстойваюць выбар сумленнага народа. Не мог пакінуць астравок свабоды і я, ужо больна хацелася пажыць сярод сваіх аднадумцаў. А перамога здавалася такой хуткай. Я разумеў, што яе трэба яшчэ адстаяць. Вось і стаяў.

Ужо вечар. Чацвёрты вечар свабоды на плошчы Каліноўскага. Вочы заплюшчваюцца ад стомленасці, а ногі ўжо даўно згубілі кантроль і дзейнічаюць самастойна. Іх справа невялікая – стаяць да перамогі. У руцэ свечка, на сэрцы незразумелая песня – малітва да Сонца.

Стаю. Вакол людзі. Шмат людзей. Шмат свечак. Сцягі, сінія стужачкі, балёнікі, родная музыка – усё перамяшалася ў адзіны подых – дух рэвалюцыі! Засталося няшмат – дастаяць да Дня Волі. Недзе побач і перамога.

Каля мяне дзве спадарыні: незнаёмыя, але родныя. Усе тут, у намётавым гарадку, браты і сёстры, па іх венах цячэ аднолькавая кроў – свабодная. Дзяўчынкі гутараць на спрадвечныя тэмы, і я непрыкметна для самога сябе далучаюся да іх размовы. Далучаюцца і іншыя людзі. Паступова нашая размова зліваецца з тысячамі такіх жа. Узнікае адзіная палымяная гутарка, якая, як малітва, ўздымаецца над вячэрнім Менскам.

– Сёння тэлефануе мне брат і запытваецца: "А ці праўда, што вам на плошчы даюць па дваццаць тысячаў у дзень," – крыўдзіцца суразмоўца. – Я не магла яму нічога адказаць. Няўжо ён здольны аб такім нават падумаць.

Твар дзяўчыны хаваўся пад сіняй хусткай, але вочы, гэтыя родныя, простыя вочы, з якімсьці болем і дзівочай пяшчотай час ад часу глядзелі на мяне, шукаючы адказ на складанейшыя пытанні.

---

– Дзесяць сутак, – суддзя манатоннай хуткай гаворкай аб'яўляе мне прысуд. Я не звяртаю на яе ўвагі. Я стомлены і дужа хачу спаць. Дзесяць дзён няволі – нішто ў параўнанні з чатырма днямі свабоды.

...Акрэсціна. Вялікія ланцугі непакароных уладзе. Усе яны трапілі з плошчы за краты чацвёртай ноччу свабоды.

Нарэшце турэмны пакой. Цяпер ніхто не будзе чапаць. Дабіраюся да драўлянага ложка і заплюшчваю вочы. Не спіцца! Перад вачыма паўстае твар, захутаны ў сінюю бандану, гэтыя вочы, поўныя загадкавых пытанняў, голас, напоўнены болем за лёс Радзімы.

Жыццё працягваецца, пакуль што за кратамі, але гэтыя вочы заўсёды суправаджаюць мяне, а разам з тым жыве надзея ўбачыць зноў яе – дзяўчыну, народжаную рэвалюцыяй!

**Юрка БАКУР**


**Фота: photoclub.by**

### ЖАЎРУК.

Птушка шэрая, непрыкметная
Дзесьці цешыцца на раллі,
Ты не бачыш яе, але ведаеш,
Як спявае яна ўвышыні.

Цела птушачкі разрываецца,
У неба сіняе паляціць.
Гучнай песняю напаўняецца
Наваколле. Зямля гучыць.

Народ мурзае, прыгінаецца
На спрадвечна сваёй зямлі,
Але хваля яго падымаецца.
Наліваюцца ветрам сцягі.

Жаўрук-сонейка, прыляці хутчэй,
Песню звонкую прынясі.
Ты, народзе мой, не хавай вачэй,
Хвалю гэтую не гасі.

Потым свята будзе вялікае,
Людзі скажуць,што ім баліць.
Шчасце праўдай, свабодай налітае,
Гучнай песняю зазвініць.

**31.03.2006**

**Юрка БАКУР**

---

## АДКРЫЎСЯ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА

У Берасці пасля месячнага перапынку ізноў адчыніў дзверы Музей гісторыі горада.



Перапынак быў выкліканы рэструктурызацыяй музея, але яго супрацоўнікі не гублялі час марна і паспелі падрыхтаваць да адкрыцця новую экспазіцыю. Яна прысвечана Берасцю "за польскім часам", то бок 20-30-м гадам XX-га стагоддзя.

Дырэктар музея Святлана Тамчук адзначыла, што новая экспазіцыя ўзнікла невыпадкова:

– Будынак музея пабудаваны ў 1928г. польскім архітэктарам Юліанам Лісецкім. Менавіта ён спраектаваў цэнтральную частку горада, што месціцца вакол сённяшняй плошчы Леніна (т.зв. калонію імя Нарутовіча – першага прэзідэнта Польшчы). Гэта і будынак ваяводства (сёння – аблвыканкам), банка (сёння – упраўленне Нацбанка па Берасцейскай вобласці), шмат іншых адміністрацыйных і жылых пабудоў. За часамі панавання царскай Расеі Берасце не дазвалялася разбудоўвацца ў заходнім накірунку з прычыны блізкасці да Берасцейскай крэпасці. Дзякуючы Юліану Лісецкаму мы маем сёння ў цэнтры горада прыгожы кампактны і практычны адміністрацыйны раён.

Новая экспазіцыя складаецца з побытавых рэчаў тых часоў, мапаў, архітэктурных планаў, вялікай колькасці фотаздымкаў.

## ПРЫДУМАНАЕ СВЯТА

23 лютага, працягваючы старую савецкую традыцыю, на Беларусі паўсюдна святкуюць "Дзень Абаронцы Айчыны і ўзброеных сілаў". Нягледзячы на рэкордна нізкую тэмпературу, гандляры на рынках Берасця ўсе, як адзін, выйшлі на працу. Бо тавараабарот у гэты дзень падскоквае ледзь не ў 5 разоў. Асноўны попыт прыходзіцца, зразумела, на прылады для галення і мужчынскую парфуму.

Гісторыя гэтага свята вельмі цьмяная, а таму цікавая. Справа ў тым, што спачатку з'явілася дата – 23 лютага "Дзень Савецкай Арміі", а ўжо потым пачалі адшукваць нагоду. Варыянтаў было некалькі. Спачатку сцвярджалася, што ў гэты дзень была створана Чырвоная армія. Але ж высветлілася, што дэкрэт аб стварэнні быў падпісаны яшчэ ў снежні. У 1938г. з'яўляецца новая версія: нібыта "ў гэты дзень Чырвоная Армія дала акупантам рашучы адпор пад Нарвай і Псковам, дзякуючы чаму іх наступленне было прыпынена."

У напружаным 1942-м таварыш Сталін зрабіў папраўкі ў гэтай фармулёўцы і цяпер "Маладыя атрады Чырвонай арміі нагалаву разбілі нямецкіх захопнікаў". Як паказалі гістарычныя даследаванні, аніякіх перамог, на жаль, чырвоная армія ў тыя часы не мела. Але ж міф застаўся, і гэтае выпадковае свята без нагоды святкуюць ужо ледзь не дзевяносты год у Расеі і на Беларусі.

Цікава, што ў Чачэніі гэты дзень лічыцца днём нацыянальнага смутку.

Але ўсё ж, сёння замёрзлыя гандляры лічаць свой звышпрыбытак. А беларусы, якія знаёмыя са сваёй гісторыяй, прыйдуць за падарункамі 8 верасня. Бо ў гэты дзень будуць адзначаць "Дзень беларускай вайсковай славы".

У гэтага свята сапраўды слушная нагода – перамога ў бітве пад Воршай, якая адбылася на досвітку 8 верасня ў 1514 г. Тады 30-цітысячнае войска Канстанціна Астрожскага атрымала бліскучую перамогу над 80-цітысячнай арміяй расейцаў. Аршанская бітва ўвайшла ў еўрапейскія хрэстаматы з ваеннай гісторыі як узор удалай тактыкі змагання з нашмат пераважаючымі сіламі ворага.

**Dzedzich week-news**

# ДАЛОЎ ВЫШЫВАННЕ Ў ВОЛЬНЫ ЧАС!!!




**Футболка (саколка) для часання спіны**
**Сапраўдным сябрам з'яўляецца той, хто прапануе пачасаць вам спіну. Аднак сапраўднай трагедыяй можа стаць тое, што часам ён не ў стане правільна вызначыць месца часання. Спецыяльная мапа дапаможа яму зрабіць дакладную наводку на аб'ект.**

**ДЭПРЭСНЯК ДАВЁЎ ДА ТАГО, ШТО ВЫ ПАЧАЛІ ВЯЗАЦЬ? АПАТЫЯ ДА ЖЫЦЦЯ ЗАБІВАЕ, А НАСТРОЙ НІЖЭЙ ЗА ПЛІНТУС? А МОЖА ПРОСТА НЯМА ЧЫМ ЗАНЯЦЦА? СТОП! ЁСЦЬ РАШЭННЕ! ТВОЙ РАТАВАЛЬНЫ ЖЫЛЕТ ТУТ. ВОСЬ НЕКАЛЬКІ СВЕЖЫХ І НЕЗВЫЧАЙНЫХ СПОСАБАЎ ЗАНЯЦЬ СЯБЕ. МОЖА, МЕНАВІТА ЯНЫ БУДУЦЬ ВАМ ДАСПАДОБЫ.**

## ГЕАКЭШЫНГ (GEOCACHING)

Геакэшынг (з грэч. "geo" - Зямля, з анг. "cache" – тайнік) – праваблівая гульня, у якую граюць ва ўсім свеце. Адначасова і вельмі старая, і зусім новая.

З даўніх часоў пошук скарбаў быў для чалавецтва забаўляльным заняткам, але толькі са з'яўленнем двух вялікіх адкрыццяў – інтэрнета і спадарожнікавай GPS навігацыі – гульня набыла масавы характар.




Сутнасць у тым, што адныя гульцы ствараюць тайнікі, пры дапамозе GPS вызначаюць іх каардынаты і выкладаюць іх у Сеціве, а астатнія – па гэтых каардынатах спрабуюць знайсці тайнікі. Скарб рэкамендуецца ствараць у месцах, якія ўяўляюць прыродную, гістарычную, культурную, геаграфічную цікавасць. Таму кожная кропка, адзначаная каардынатамі, валодае асаблівай прыцягальнай сілай не толькі для ўладальнікаў GPS, але і для людзей, каторыя цікавяцца гісторыяй роднага краю, геаграфіяй і да т.п.

Тайнікі бываюць розныя. Найбольш распаўсюджаны (традыцыйны) уяўляе сабой кантэйнер з накрыўкай, у якім знаходзяцца "скарбы" – дробныя прадметы (кружэлкі, касеты, цацкі, кнігі і да т.п.) і нататнік для тых, хто адшукаў тайнік. Гулец мае права адзначыцца ў нататніку і забраць любы прадмет з кантэйнера, але ўзамен абавязаны пакінуць раўназначны прадмет.

Пасля наведвання тайніка гулец павінен закрыць кантэйнер і, замаскіраваўшы, змясціць яго на першапачатковае месца. Застаецца толькі напісаць пра сваё наведванне ў інтэрнэтаўскай гасцёўні тайніка.

Геакэшынг – гульня, у якой могуць удзельнічаць усе ахвотныя незалежна ад узросту, полу альбо сацыяльнага становішча. У яе можна гуляць з сям'ёй, кампаніяй ці аднаму. Як вам такая ідэя?

## ТРАФАРЭТ (ART OF THE CLICHE)

Мільёны гадоў чалавечай гісторыі захавалі самы просты і эфектыўны спосаб самавыражэння – адбітак далоні на сцяне пячоры, сцяне першабытнага прыстанішча. Гэты першы твор выкананы ў тэхніцы трафарэта (фарба нанесена вакол сілуэта).

Трафарэт – гэта вулічнае мастацтва, якое набыло маштабны характар. Нярэдка можна пабачыць знакі, сімвалы і малюнкі на сценах, зробленыя балончыкам з фарбай і трафарэтам. Сутнасць іх – жэст, які пакідае ўнікальны след. Выявы, што наносяцца на сцены, прымушаюць задумацца, яны выяўляюць вострыя сацыяльныя праблемы.

Аднак, на жаль, як і бальшыня відаў вулічнага мастацтва, трафарэт – гэта крымінальнасць. Закон разглядае яго як "псаванне" сцен. Усё гэта ператварае вулічны трафарэт у аб'ект пільнай увагі як з боку ўлады, так і простых грамадзян.

## БУККРОСІНГ (BOOKCROSSING)

Аб'яднанне людзей, якія зняпраўджваюць стэрэатыпы – менавіта так можна назваць буккросераў, бо ніколі ў гісторыі не было такога стаўлення да кнігаў.



Яны пакідаюць свае кнігі на вуліцы, каб кожны жадаючы меў магчымасць іх прачытаць. "Прачытаў – аддай другому" – менавіта гэтак гучыць дэвіз буккросераў.

Гэты рух узнік у 2001 годзе ў ЗША, пасля перамясціўся ў Еўропу. ¨н быў цёпла сустрэты ў Італіі і Францыі, затым распаўсюдзіўся далей, аж но да Фінляндыі. Цяпер у свеце ў сістэме распаўсюду кніг зарэгістравана больш за 250 000 чалавек і 1 000 000 кніг.

Зарэгістраваўшы сябе і надаўшы кнізе спецыяльны нумар, вы пакідаеце яе ў загадзя прыдуманым месцы (кавярні, парку, вакзале, аўтобусе і г.д.), дзе любы чалавек можа ўзяць і прачытаць яе. Такім чынам, адбываецца "вызваленне" кнігі – ратаванне ад знаходжання яе на палічцы. А былы ўладальнік кнігі заўсёды будзе ведаць пра яе перамяшчэнне, атрымоўваючы e-mail пра тое, у чые рукі яна патрапіла і як яна там апынулася. Другой, і ўскоснай, мэтай з'яўляецца ператварэнне ўсяго свету ў "вялізную бібліятэку".

Гэта выдатна: тыя, у каго няма грошай, змогуць чытаць харошыя кнігі, ды і хатнія бібліятэкі бессэнсоўныя – там столькі кніг, якія больш ніхто і ніколі не будзе чытаць. Карацей, бярыце аднудзве кнігі з палічкі і далучайцеся.

## ЧЫНДОГУ (CHINDOGU)

Чындогу або шынтоку – гэта "Таварыства непатрэбных вынаходніцтваў" (з яп. "догу" – прыстасаванне, інструмент; "чын" – непатрэбны).

Сябры гэтай арганізацыі вынаходзяць толькі рэальна здзяйснімыя, але практычна бессэнсоўныя рэчы, а таксама ніколі не патэнтуюць і не прадаюць свае вынаходніцтвы.

Напрыклад, партатыўная "зебра" для пешаходаў, жадаючых пераходзіць вуліцу там, дзе ім захочацца. Ліхтарык, што працуе ад сонечнай батарэі. Стальная накладка з шыпамі для наскоў чаравікаў, каб вам не адтоптвалі ногі ў грамадскім транспарце. Закрывалка для рыбінае галавы, каб адгарадзіць повара ад траўмуючага позірку вачэй паміраючай рыбы.



**Зубная шчотка на палец**
**Максімальная адчувальнасць пры чыстцы зубоў. Таксама можа прымяняцца ў вандроўцы ці падарожжы.**

У "Таварystве непатрэбных вынаходніцтваў" цяпер каля 50 тысяч сябраў у Японіі і за яе межамі.

Вынаходніцтва настолькі пранікла ў побыт грамадзян, што нават гумар не абыходзіцца без вынаходніцтваў. Вы падрыхтаваны разумна жартаваць?

## ХІЛІС (HELEES)

Ролікавыя красоўкі – гэта хіліс. Прынцып дзеяння вельмі просты і геніяльны – неабходна зашчапіць ролік у пятку – і вы зможаце ехаць. Цяпер не трэба пераабувацца, калі вы захочаце рухацца хутчэй, а калі паверхня не дазваляе каціцца – проста здыміце вашыя ролікі – і вы ізноў у звычайных красоўках. Два ролікі дыяметрам 35 мм змяшчаюцца нават у кішэні.

Вы можаце коўзацца ў памяшканнях – інстытут, школа, крама, дыскатэка, офіс і паўсюль, дзе ёсць прынамсі 2 метры вольнай прасторы. ¨сць мадэлі рознага дызайну і функцыянальнага прызначэння. ¨сць нават адмысловыя мадэлі з пластмасавымі ўстаўкамі на падэшве для скатвання па поручнях лесвіц!

Штогод продаж хіліс узрастае на 50-60%. Гэта становіцца сапраўднай моладзевай культурай. Праводзяцца чэмпіянаты свету па коўзанні на хіліс, шоу, дзе танчаць на хіліс.

Хіліс можна зрабіць і самому: два невялікія калёсікі (можна абцясаць ад скейта), плюс старыя красоўкі-скутэры; калёсікі павінны быць у пятцы.

**Аляксандра КОЎГАН**

# АВГУСТОВСКИЙ КАНАЛ. ОСЕНЬ


Фота: photoclub.by

**ВОКРУГ РЕКОНСТРУКЦИИ АВГУСТОВСКОГО КАНАЛА ШУМА БЫЛО МНОГО. ДЕНЕГ ТУДА ВЛОЖИЛИ ЕЩЕ БОЛЬШЕ. НАДЕЯЛИСЬ СДЕЛАТЬ ЖЕМЧУЖИНОЙ БЕЛОРУССКОГО ТУРИЗМА. НО ПРОШЛО ВРЕМЯ. ДЕНЬГИ ПОТРАТИЛИ, РЕКОНСТРУКЦИЮ ЗАВЕРШИЛИ. НО ГДЕ ЖЕМЧУЖИНА?**

Попытаемся разобраться, что сегодня представляет собой распропагандированный водный рай для туристов.

Реконструкция белорусской части Августовского канала была завершена в июне 2006г.

На нее ушли два года и 37 млрд. рублей. Но ни официального открытия, ни торжеств по случаю окончания работ не было. Гродненский облисполком поначалу ссылался на плотный рабочий график премьер-министра Сергея Сидорского, который должен был присутствовать на торжественных мероприятиях. Позже свалили все на польскую сторону, которая свои приграничные шлюзы восстановит только в 2007 году.

Но строители из нескольких десятков организаций области, работавших на канале, все же устроили свой праздник по случаю завершения работ. Около 100 человек проплыли на пароходе вверх по течению восстановленной водной магистрали – от Немана до границы с Польшей.

Впрочем, и строителям, и Гродненскому облисполкому было не до праздника. Республиканская коллегия Госконтроля, рассмотрев материалы проверки использования средств, выделенных на реконструкцию Августовского канала, отметила, что "необоснованное применение повышающих коэффициентов к отдельным расценкам и нормам привело к дополнительным расходам".

Всего, по расчетам специалистов Госконтроля, неэффективно было использовано государственных средств на сумму более 400 млн. рублей. К субъектам предпринимательской деятельности, работавшим на канале, применены экономические санкции в сумме 82,7 млн.рублей. К административной, дисциплинарной и материальной ответственности привлечено около 50 работников. Директор РУП "Белгипроводхоз" Г.В. Азява и вовсе освобожден от должности.

В деревнях, расположенных вдоль Августовского канала, за последние 10 лет в два раза уменьшилось число жителей. Колхоз развален, школы закрыты, трудоспособное население уехало в город. Есть такие хутора, где не осталось ни одной женщины.

О президентском указе, дающем им возможность за деньги принимать туристов, аборигены ничего не знают. Да им это и не нужно. Старикам просто не под силу в их домах-развалюхах оказывать "услуги, связанные с размещением, транспортным и иным обслуживанием агроэкотуристов".

В деревне Немново, где расположен самый большой 4-камерный шлюз, с приемом туристов даже при большом желании пока ничего не получится: в подвалах и огородах стоит вода. После того как пароход с низкой осадкой сел на мель, уровень воды в канале подняли. Она тут же затопила близлежащую территорию. Теперь в домах местных жителей – сырость и комары, а "Гродномелиоводхоз" срочно прокладывает трубы, чтобы отвести воду от деревни.

Сегодня на Августовском канале – тишина. Такая же, как и была до шумихи с реконструкцией. Немноголюдно и на живописном шлюзе Домбровка. Работают две автолавки, причем палатка предпринимателя задвинута подальше в отличие от государственного магазина на колесах. Не видно отдыхающих и в Немново, и во всех 14 деревнях вдоль канала. Решением Гродненского облисполкома они выведены из погранзоны, которая считалась главным препятствием для притока туристов. Зоны нет, туристов тоже. Нет на канале массового притока иностранных гостей, желающих оставить здесь валюту. Может, желающие отдать эту валюту и нашлись бы, да вот желающих взять пока нет.

Обещанный рай для туристов, похоже, наступит еще не скоро. Нет ни гостиниц, ни ресторанов, ни отреставрированных старинных усадеб, которые были заложены в проект реконструкции.

Единственную байдарку с польскими туристами уже несколько раз показали по БТ. А канал на радость рыбакам зарастает тиной и камышами. Еще в мае Госконтроль поручил Гродненскому исполкому "активизировать работы по пропаганде туристических возможностей канала". Но "пропаганда" и "реклама" в мире бизнеса – вовсе не одно и то же. Возможно, поэтому ни туристы, ни инвесторы на Августовский канал не спешат.

## СПРАВКА

Белорусская часть Августовского канала – участок в 21,2 км единого водного пути длиной 102 км, соединивший в XIX веке реки Вислу и Неман. В 60-х годах XX века польская часть Августовского канала была восстановлена. Там принимают до 70 тыс. туристов в год, построены отели, рестораны и лодочные станции, а местное население неплохо зарабатывает на экотуризме.

На территории Беларуси памятник гидротехнического строительства после Второй мировой войны был снят с баланса и пришел в запустение. В 2004 году издан Указ президента «Об организации работ по реконструкции части Августовского канала». В 2006 году на канале были восстановлены шлюзы, построены мосты, дороги и обводной канал. Подготовлено досье для включения Августовского канала в Список всемирного культурного наследия ЮНЕСКО.

**Наталья МАКУШИНА**

## "КАРАЛЕЎСКІ КАНАЛ" У КОБРЫНЕ ПАЧНЕ ПРАЦАВАЦЬ

**ВЫКАПАНАЯ РУКАМІ ПРЫГОННЫХ ВОДНАЯ АРТЭРЫЯ АБВЕШЧАНА ЎДАРНАЙ БУДОЎЛЯЙ БЕЛАРУСКАЙ ЭНЭРГЕТЫКІ. СЁЛЕТА ТУТ З'ЯВІЦЦА ГЭС.**

У 1775 г. на загад караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага кіркамі ды рыдлёўкамі пачалі пракладваць той шлях для вады. Гэта быў амаль адзіны ўчастак сушы, які замінаў скразному руху суднаў ад Чорнага мора да Балтыйскага.

Канал, які палешукі назвалі "Каралеўскім", спраўна служыў для перавалкі рачных грузаў. Берагі воднай артэрыі тройчы пашыралі. У перыяд СССР з ГДР, Польшчы, Чэхаславакіі ды Вугоршчыны па ім перавозілі стратэгічныя грузы. У апошнія 15 гадоў рух суднаў практычна спынены.

Сёння дырэктар РУЭПС "Дняпроўска-Бугскі водны шлях" Іван Кеявец абвясціў пра намеры задзейнічаць канал ў энэргетыцы.

Па яго словах, па ўсходнім схіле – ад Пінска да Кобрына — у год скідваецца да 500 мільёнаў кубаметраў вады. Перапад на гідравузлах складае ад 2 да 3 метраў. Але цяпер нават у летнюю навігацыю выкарыстоўваецца толькі 2% вады.

І.Кіявец упэўнены, што на канале можа працаваць мінімум 5 малых ГЭС. Першая з плануемых – Дубайская. Са словаў сп. Кіяўца, яна зможа выпрацоўваць у год 1,4 млн. кілават і цалкам вырашыць праблему забеспячэння "Днепрабугводшляху".

ГЭС будзе каштаваць два мільярды рублёў. Абяцаны тэрмін вяртання капіталу – 6-8 гадоў.

Супраць ідэі выступаюць эколагі. Яны даводзяць, што будаўніцтва ГЭС парушыць жыццё палесскіх звяроў і птушак. Знікне раўнавага, якая ўсталявалася за час перадыху ад татальнай меліярацыі.

## БАБРЫ СТАЛІ ПРЫЧЫНАЙ ЭКАЛАГІЧНАЙ КАТАСТРОФЫ

**БАБРЫ СТАЛІ ПРЫЧЫНАЙ АВАРЫ НА АЧЫСТНЫХ ЗБУДАВАННЯХ СТОЛІНА.**

Яны прарылі норы ў дамбе столінскіх ачыстных збудаванняў, якія знаходзяцца ўсяго ў 4-х км ад горада. Праз 2 пашкоджаныя перагародкі сточныя воды хлынулі ў бліжэйшы лес, затапіўшы больш за гектар плошчы, а з яго ў аварыйны абводны канал і далей — у запаведнае балота Морачна.

8 адзінак спецтэхнікі і 18 чалавек ліквідоўвалі прарыў дамбы. Для яе ўмацавання пакладзена 500 мяшкоў з пяском. Пакуль невядомы памер шкоды, нанесенай бабрамі прыродзе.

Начальнік раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Васіль Патапчук адзначыў, што Столін даўно "перарос" дзеючыя ачыстныя збудаванні. ¨н настойвае на тым, што палі ачысткі трэба ўмацоўваць, пашыраць, а таксама адсяляць баброў, што знайшлі для сябе там зручныя для пражывання мясціны.

## БЕРАСЦЕЙСКІ БУРШТЫН НЕ ГОРШЫ ЗА ПРЫБАЛТЫЙСКІ

**РЭСПУБЛІКАНСКАЕ ЎНІТАРНАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА "БЕЛГЕА" ПАЧАЛО РАЗВЕДКУ АДКЛАДАННЯЎ БУРШТЫНА І ВЫЗНАЧЭННЕ ЯГО КОЛЬКАСЦІ Ў ШЭРАГУ РАЁНАЎ БЕРАЦЕЙСКАЙ ВОБЛАСЦІ.**

Як паведамляюць супрацоўнікі дэпартамента па геалогіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, мэтай даследавання ёсць вызначэнне перспектыў прамысловай здабычы гэтага мінерала.

Першыя спробы разведкі бурштына на Берасцейшчыне былі здзейсненыя яшчэ ў 1983г. Знойдзены тады беларускі бурштын нічым не адрозніваецца па знешнім выглядзе ад балтыйскага і выкарыстоўваецца ў ювелірнай справе.

**Dzedzich week-news**

# ІДЭАЛАГІЧНАЯ ПРАФІЛАКТЫКА СТУДЭНТАЎ НА АКРЭСЬЦІНА

**АРТЫКУЛ TARKI – АБ СУСТРЭЧЫ СТУДЭНТАЎ У СЛЕДЧЫМ ІЗАЛЯТАРЫ НА АКРЭСЦІНА З ПРАДСТАЎНІКАМІ МУС, ЯКІЯ НАЛАДЗІЛІ ТАМ ІДЭАЛАГІЧНУЮ ГАДЗІНУ ПРА ЎДЗЕЛ ЗАТРЫМАНЫХ СТУДЭНТАЎ У АКЦЫЯХ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ.**

Дзяжурныя міліцыянты на паверсе любілі зазіраць да нас у камеру – там маладыя прыгожыя дзяўчаты, разумныя, вясёлыя, упэўненыя. Не здзівіліся мы і на гэты раз, калі замест акенца для ежы адразу ж адчыніліся цяжкія жалезныя дзверы. Замест звыклых для нас дзяжурных у камеру залятае малады мужчына не ў форме з нейкімі спісамі.

– Студэнты ёсць? Давайце трох з камеры, – кажа нам і пачынае перапытваць, блытаючыся, хто з нас студэнткі. А такіх у нашай камеры абсалютная большасць. Я па ўласнай ініцыятыве далучаюся ў "шчаслівую" тройку студэнтак, што кіруюцца на незразумелую сустрэчу.

– Апранаемся зараз жа і за мной! – загадаў той мужчына.

Думкі аб тым, куды ж нас павядуць, мрояца розныя. Самая першая версія – на размову да КДБ. Зрэшты, таму я і пайшла – каб дзяўчатам было спакайней ды ў сілу звычайнага жадання пагля́дзець, хто каго возьме пытаннямі – яны нас ці мы іх. Таксама была думка, што нас хочуць перавесці на апошні дзень у іншую камэру, як перавялі двух нашых дзяўчатаў перад прыездам на Акрэсціна прадстаўнікоў АБСЕ – каб паказаць, што камеры "амаль" не перанаселеныя.

Першы раз за 10 сутак апранула куртку, абутак і выйшла на калідор. Там ужо стаялі хлопцы – ля дзесяці чалавек – аброслыя, шчаціністыя і памятыя, але нашыя :). Нас калёнаю вывелі на вуліцу – дзённае святло сляпіла вочы, ногі цяжка цягнулі за сабой цёплы абутак без матузкоў – на вуліцы ўжо была вясна. Нас завялі ў іншы будынак на Акрэсціна – той, дзе мы былі перад "расфасоўкай" па камерах – дзе праводзілі вобшук, здымалі на відэа і інш. Там завялі ў залю з партамі, кветкамі на падваконніках. Насупраць партаў стаяў шырокі стол, а на сцяне здаровы герб з каласкамі і чырвона-зялёны сцяг.

Потым у пакой забег той жа мужчына, што паклікаў нас з камеры. ¨н перапытаў, ці ўсе прысутныя студэнты. Натуральна, аказалася, што не ўсе, бо з дакументацыяй у іх там сапраўды нейкія праблемы. Незразумела, як яны разбіраюцца з рэальнымі злачынцамі, калі з-за гэтай бюракратыі ў іх безліч памылак. У аднаго мужчыны, што сядзеў за партай, ён запытаўся, за што яго затрымалі і ці быў ён сапраўды на плошчы. Мужчына адказаў, што не быў – была жонка, а ён уначы ёй нёс гарбату – ён нават не дайшоў, як яго забралі.

Мы пачалі актыўна перамаўляцца – хто з якой ВНУ, хто ў якой камеры, шукаць знаёмых. Яшчэ праз колькі часу ў пакой зайшла цэлая дэлегацыя: дарослы мужчына ў гальштуку, яшчэ адзін міліцыянт з сур'ёзнымі пагонамі, два нейкіх дарослых мужчыны ў цывільным, адзін супрацоўнік адміністрацыі прыёмніка-размеркавальніка. Яны ўсе прайшлі за стол.

Мужчына ў гальштуку пачаў размову. ¨н прадставіўся кіраўніком аддзелу прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў – спадар Дрозд. Таксама ён прадставіў мужчыну з сур'ёзнымі пагонамі – свайго намесніка сп. Маліноўскага. Двух іншых таварышаў ён прадставіў выкладчыкамі, прафесарамі. Адзін з іх падкрэсліў: кандыдаты.

Сп. Дрозд патлумачыў мэту сустрэчы: выслухаць пэўныя прэтэнзіі, даведацца, якія ў нас думкі на будучыню, ці лічым мы сябе вінаватымі і наколькі змяніліся нашы думкі пасля 10 сутак у камерах.

Я першая падняла руку і запыталася, як клічуць "кандыдатаў". Сп. Дрозд назваў прозвішчы і адзначыў, што яны працуюць ў Акадэміі МУС, адзін з іх – псіхолаг :).

І адразу ж асёкся – гэта не КДБ, вы не думайце! Усмешкі з нашага боку – "а мы і не думалі – вы самі гэтую тэму паднялі". Дрозд пачаў тлумачыць па-іншаму:

– Мы хочам шчыра паразмаўляць, мы таксама




бацькі і ў нас ёсць дзеці, у іх таксама ёсць свае думкі – давайце пагаворым…

– Сапраўды, вы бацькі, у вас дзеці нашага ўзросту і таму пытанне, якое я задам, канешне ж, турбуе і вас. Патлумачце мне, чаму я, маладая дзяўчына, не магу спакойна гуляць са сваім каханкам у парку? Вы не баіцеся, што вашы дзеці выйдуць на вуліцу, а іх зацягнуць невядомыя ў аўтобус, у якім сядзяць збітыя людзі ў крыві. Не баіцеся, што вашых дзяцей будуць судзіць паводле пратаколу, які складзены з памылкамі, а сведкамі будуць людзі, якіх вашы дзеці нават не ведаюць. А потым суддзя дасць вашаму дзіцяці 10 сутак, і яму нават не дазволяць вам патэлефанаваць. Вы не баіцеся за сваіх дзяцей?..

Псіхолаг на мае пытанні заявіў, што я "нейкі арганізатар" – "гэта па вас адразу бачна!".

Размова была насычанай – за вакном хутка сцямнела. Вось урыўкі "прафілактыкі".

Міліцыянт:

– Ну а як у вас у душы, скажыце шчыра, як на сэрцы, як вы ставіцеся да гэтых акцыяў? У душы вы супраць сучаснага дзяржаўнага ладу?

– Я магу быць Васю люблю ў душы – гэта мая прыватная справа.

* * *

– Як адаб'ецца нашае затрыманне на навучанні? Нас павыключаюць з ВНУ?

Дрозд:

– Мы ладзілі сустрэчу з Міністэрствам адукацыі. Нікога выключаць не будуць! Ну там толькі двоечнікаў і прагульшчыкаў… А за палітыку – нікога!

* * *

Міліцыянт:

– Вы паглядзіце, як прыбалты жывуць! Яны ж нам зайздросцяць! У параўнанні з савецкім часам мы жывем выдатна! Што вунь у Латвіі творыцца…

– А Літва?

– Да вы хоць былі там?

– Канешне! - паварочваючыся да іншых затрыманых, – Сябры, прапаную пасля "адсідкі" разам на тыдзень з'ездзіць у Вільню – там адпачнем і паглядзім – як жа ж "складана і цяжка" там жыць :).

***

– Кожны з тут прысутных быў затрыманы не на акцыі, а ў ваколіцах. Які закон я парушыла, гуляючы з каханым хлопцам у парку?

Выкладчык з АМУС:

– У нармалёвых людзей ёсць нармалёвае пачуццё страху. Некаторыя тэлефанавалі 19-га ў міліцыю і запытваліся, ці можна сёння выходзіць на вуліцу… А вы чаго там хадзілі? Дома трэба сядзець.

* * *

Міліцыянт:

– У вас быў час падумаць над сваімі поглядамі. Ці зразумелі вы свае памылкі?

Хлопец з затрыманых:

– Раней я сабе ціха вучыўся, кніжачкі ціха чытаў і ў палітыку не лез. Але, калі я адсядзеў 10 сутак – мае погляды дакладна вызначыліся.

* * *

Міліцыянт:

– Не слухайце казачкі, якія вам распавядаюць у камерах – пра затрыманні і збіццё. Усё гэта казачкі! У іх устаноўка такая – распавядаць вам казкі.

– У нас у кожнага такая "казачка"…

Кажучы ў цэлым, арганізатары сустрэчы яўна не чакалі такога развіцця падзеяў. Складалася ўражанне, што сустрэчу праводзім мы, а не яны. Распіраў гонар, што мы аргументавана спрачаліся, една, разумна, не паддаючыся на правакацыі. Крыху расчараванне ад таго, што часта гэтыя дарослыя мужчыны з вышэйшай адукацыяй, седзячы перад намі – збольшага студэнтамі – казалі проста нелагічныя рэчы, не адпаведныя гісторыі, не адказвалі на пытанні, мітусліва выкручваліся. Мы падсвядома чакалі, што яны будуць больш моцныя, а яны непрыемна слабыя. Яны баяцца, яны апраўдваюцца.

Я ганаруся людзьмі, што прысутнічалі там, сядзелі за партамі і адстойвалі свае думкі. Іх перакананне ўжо не зменіць нічога. Нават выпадковыя людзі, якія сапраўды проста праходзілі міма Кастрычніцкай, цяпер маюць СВА¨ стаўленне да сітуацыі ў краіне, маюць гатоўнасць бараніць сябе і свой выбар. Як могуць нашы бацькі, што стаялі пад Акрэсціна верыць у "стабільную і працвятаючую" краіну, калі іх дзеці-студэнты кінутыя за краты, а па тэлебачанні іх называюць наркаманамі і паказваюць сфабрыкаваныя рэпартажы?

Тых людзей, хто прайшоў праз Акрэсціна, Жодзіна – ужо нічога не стрымае. Адтуль выйшлі ўпэўненыя людзі, перакананыя, свабодныя. І там (тут) на волі іх сустрэлі такія ж свабодныя і ўпэўненыя людзі, якія прайшлі праз Дзень Волі, праз ночы ў намётавым гарадку на Кастрычніцкай, пра людскую салідарнасць, калі людзі аддавалі тым, хто стаіць на пляцы, свае курткі, прывозілі ежу. Калі побач стаялі студэнты і выкладчыкі, школьнікі і старэнькія бабулькі, якія ў адну ноч перад Акрэсціна спявалі нам "Магутны Божа…"

Я ганаруся тым, што мы робім гісторыю. Ганаруся тым, што мы свядомыя, упэўненыя і моцныя. Мы пераможам – я гэта ведаю.

**TARKA, 11.04.2006**

## ДАРЭЧЫ

Там, дзе ў іншамарках знаходзіцца слоган "Airbag", уладальнікі расейскіх аўтамабіляў змяшчаюць "Спаси и сохрани!"

***

- Учора ў Кацькі сын нарадзіўся. Усім інтэрнатам імя прыдумлялі. Заўтра будзем імя па бацьку прыдумляць.

***

- Якая розніца паміж проста сябрам і сапраўдным сябрам?
- Проста сябар дапаможа вам перавезці рэчы, а сапраўдны сябар - труп.

***

Дзяўчынка Таня, гуляючы на тонкім ільдзе, высветліла, што лёд зверху ламаецца значна лягчэй, чым знізу...

***

Два электрыка сядзяць на слупе. Унізе праходзіць бабка:
- Бабка, падай провад!
- Трымай, сынок.
- Ну вось, а ты кажаш: "Фаза, фаза".

***

На тры рэчы можна глядзець вечна: на агонь, на ваду, і як бландзінка паркуецца.

***

У нас хто што ахоўвае - той гэта і мае. Вось, напрыклад, па законе, прэзідэнт павінен ахоўваць канстытуцыю...

***

- Мама, глядзі, я моцны, як тата - я таксама вілы паламаў!
- Блін, яшчэ адзін мудак расце!

***

Правал мужчынскай зборнай па біятлоне адкрыў сакрэт доўгага жыцця прэзідэнта! Аказваецца, у краіне проста няма людзей, якія ўмеюць метка страляць і хутка бегаць.

Мядзведзі не ядуць медзвядзяў.
Тыгры не ядуць тыграў.
А сабакі не ядуць доктарскую кілбасу.

***

А ў мяне жонка на сакрэтным заводзе працуе, у начную змену. Іх там на заводзе піць прымушаюць, каб яны не памяталі, што робяць. Яна нічога і не памятае, прыходзіць кожную раніцу, ледзь на нагах стаіць. Але грошы вялікія прыносіць!

***

- Як прасцей за ўсё кінуць паліць?
- Проста трэба памятаць, што кожная выпаленая цыгарэта - гэта мінет, зроблены дырэктару тытунёвай фабрыкі!

***

У наш час многія ездзяць адпачываць у экзатычныя краіны, адкуль прывозяць розныя сувеніры, з якімі потым ідуць да ўрачоў-сувеніролагаў.

***

Вучоныя доўга думалі: у чым вымяраць частату.
Так і не прыдумалі. Вось і пішуць - Hz.

***

- Як вам не сорамна выгульваць сабаку без намордніка?
- Ды шкада яе, хварэе, хутка памрэ, хай хоць парадуецца крыху.
- І на што яна такое хварэе?
- Шаленства.

***

Мы вывучылі Вашу камерцыйную прапанову па распрацоўцы інфармацыйнай сістэмы і прынялі рашэнне набыць у Вас некаторую колькасць травы, якую Вы паліце.

***

Муж: "Які прыгожы дзень... Сёння гэта магло б здарыцца".
Жонка: "Што магло бы здарыцца?"
Муж: "Ды ты вось неяк казала, што ў адзін прыгожы дзень кінеш мяне".

***

Алкаголь - гэта такі оффлайнавы "Photoshop".

Пытанне: Я спампавала файл з Інтэрнэта, а аказалася, што ён мне не патрэбен. Як яго цяпер запампаваць назад?
Адказ: Дура, з-за такіх як ты хутка ў Інтэрнэце ўвогуле файлаў не застанецца!!!

***

Студэнты пытаюць выкладчыка:
- Можна мы на вашу пару не пойдзем?
- Так.
- А вы адзначаць будзеце?
- Не, я ўвогуле на працы не п'ю!

***

Малады чалавек ажаніўся, праз тры месяцы жонка кажа:
- Каханы, мне ўжо час ехаць у раддом!
- Як?!! Мы ж толькі тры месяцы як...
- Ты тры месяцы да вяселля са мной спаў, тры месяцы пасля, а 3х3=9!!!
- ! "#! "$##$

Тэлефануе яна з раддома дахаты:
- Каханы, у нас нарадзіўся чорненькі сын.
- Як! #$: #$: $,:!
- Калі мы ехалі ў раддом, нам дарогу чорная кошка перабегла, вось і чорны хлопчык.
- "#$"#: $!

Малады чалавек пайшоў да бацькоў, размаўляе з бацькам:
- Уяўляеш, тата, 3х3=9 і чорная кошка...

Бацька крычыць:
- Маці, ты не памятаеш, калі я цябе вёз ў раддом, нам асёл дарогу перабягаў ці не?

***

Чарговае апытанне 5-га канала ўкраінскага ТБ:
- Хто вінаваты ў праблемах Украіны?
а) Пуцін; б) Расея; в) Маскалі.

***

Паляшук-ветэран дзеліцца ўспамінамі:
- Неяк аднойчы падчас вайны я 10 кіламетраў цягнуў на спіне параненага камісара...
- І вас узнагародзілі?
- А як жа ж! Далі адзенне і 150 дойч-марак!!!

## КОНКУРС

### КОНКУРС ДЛЯ ЖУРНАЛІСТАЎ ГРАМАДСКІХ СМІ

**Еўрапейскі дом сустрэч — Фонд "Новы Стаў" запрашае да удзелу ў конкурсе для журналістаў грамадскіх СМІ ў рамках праекта "Грамадскія медыі Еўрарэгіёну Буг"**

Конкурс прызначаны для журналістаў і асобаў, што працуюць у Польшчы і Беларусі над выданнем лакальных газетак і бюлетэняў, якія заангажаваныя ў падтрымку грамадскіх ініцыятыў і бяруць удзел у грамадскім жыцці.

Працы (газетныя артыкулы, фотарэпартажы, цыклы здымкаў і да т. п.) могуць датычыць як мясцовых справаў і падзеяў, маючых месца ў Польшчы або Беларусі, так і трансгранічных справаў і падзеяў. Тэматыка артыкулаў можа датычыць польска-беларускага супрацоўніцтва, грамадскіх справаў, экалогіі, гаспадаркі і г.д.

Працы маюць паўстаць цягам праекта "Грамадскія медыі Еўрарэгіёну Буг" (з чэрвеня 2006г. да канца тэрміна прыёму прац) і павінны быць папярэдне апублікаваныя ў газетах, інтэрнэце, на выставе і да т.п.

Да прысланай працы неабходна далучыць інфармацыю адносна іх публікацыі (назву і нумар выдання – калі гэта адсканаваныя старонкі, якія ўтрымліваюць конкурсную працу, або экзэмпляр выдання, адрас інтэрнэт-старонкі, здымкі і інфармацыя прэсы пра выставу і г. д.)

Пісьмовыя працы не павінны перавышаць 3 старонкі друкаванага тэксту (5400 знакаў з прабеламі).

Працы на польскай або беларускай мовах трэба дасылаць па электроннай пошце на адрас: eds@eds-fundacja.pl ці на адрас:
dzedzich@dzedzich.org
(тэма ліста: Журналісцкі конкурс "грамадскія медыі Еўрарэгіёну Буг", Konkurs dziennikarski "Media obywatelskie Euroregionu Bug").

Працы можна дасылаць таксама на адрас: Europejski Dom Spotkan – Fundacja Nowy Staw, ul. 3-go Maja 18/3a 20 (калі праца дасылаецца ў машынапісным выглядзе, неабходна дадаць электронную версію на CD).

**Тэрмін дасылання прац:** да 15 красавіка 2007г.

Артыкулы будуць ацэненыя журы, у склад якога ўвойдуць прадстаўнікі Еўрапейскага Дома Сустрэч – Фундацыі "Новы Стаў" і мясцовых люблінскіх СМІ.

Фінал конкурса адбудзецца 30 красавіка 2007г. Пра вынікі конкурса ўдзельнікі будуць паінфармаваныя праз электронную пошту.

Аўтары найлепшых артыкулаў атрымаюць каштоўныя ўзнагароды. Акрамя таго, артыкулы-пераможцы будуць уключаныя ў конкурсную публікацыю.

У траўні 2007 г. у Любліне адбудзецца выніковы семінар праекта "Грамадскія медыі Еўрарэгіёну Буг", спалучаны з сустрэчай лаўрэатаў конкурса, уручэннем узнагародаў, а таксама прамоцыяй публікацыі, выдадзенай у рамках праекта.

Праект "Грамадскія медыі Еўрарэгіёну Буг" суфінансуецца Еўразвязам са сродкаў Еўрапейскай Фундацыі Рэгіянальнага Развіцця ў межах Праграмы Суседства Польшча – Беларусь – Украіна INTERREG III A /TACIS CBC.

**Dzedzich week-news**

№ 1 ДЗЕДЗІЧ
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
сакавік 2007

ПРЫ ВЫКАРЫСТАННІ МАТЭРЫЯЛАЎ БЮЛЕТЭНЯ СПАСЫЛКІ НА КРЫНІЦУ АБАВЯЗКОВЫЯ

Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі

**Заснавальнік:** Ініцыятыўная група моладзі
**Распаўсюджваецца бясплатна** на правах унутранага карыстання
**Падпісана ў друк:** 10.03.2007 у $18^{00}$
**Наклад:** 299 асобнікаў. Надрукавана на ксераксе.

**Галоўны рэдактар:** Дзмітрый Шыманскі.
**Рэдакцыйная калегія:** А. Лена, М. Ікола, Д. Змітрый, М. Арыя, С. Яргей, С. Яржук, Ю. Рась.
**Адказны сакратар:** А. Ндрусь. **Вёрстка:** Б. Дэпеша

**Кантактны тэлефон:** (0162) 23-68-02, (029) 660-57-41, (029) 725-15-39
**E-mail:** dzedzich@dzedzich.org, інтэрнэт: www.dzedzich.org